Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нашпарэлі наперад тэксту 1 р. — к.
За радок нашпарэлі поруч тэкстаў 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. аплоту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспраплатн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (3-ці дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 284 (2472) Аўторак, 11-га сьнежня 1928 г.

ЦОШТ НУМАРУ 5 кап.

4-я сэсія ЦВК СССР.

АГУЛЬНЫЯ АСНОВЫ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ І ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ.

(Спрэчкі па дакладзе т. Мілюціна.

МАСКВА, 3-XII. 3-га сьнежня, увечары Саюзнага Савета і ў Савеце Нацыянальнасьцяў распачаліся спрэчкі па дакладзе Мілюціна В. П. аб агульных пачатках землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня.

У спрэчках у Саюзным Савеце прадстаў Сібірскага краю СІЗІНЦОЎ гаворыць, што закон гэты пасьля свайго ажыцьцяўленьня зробіць вялізны ўплыў на рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Асабліва ганоўчае значэньне будзе мець той факт, што, водлуг новага закону, батракі будуць мець права побач з усімі селянамі ўдзельнічаць у ўпарадкаваньні зямельных пытаньняў.

КАСЬЦЕНКА (Паўночны Каўказ) прарэдыць проці рэдакцыі першага артыкулу праекту закону, у якім зазначаецца, што і самавольны абмен зямлёю сяляне пазбаўляюцца зямлі. Пазбавіць селяніна зямлі,—гаворыць т. Касьценка, значыць, забраць яго; адабраць у селяніна зямлю—значыць пакарать ня толькі таго, хто ўчыніў злачынства, але і яго сям'ю, бо без зямлі сям'я існаваць ня можа. У законе абходна вызначыць кару за абмен зямлёю, але нельга пазбаўляць за гэта селяніна зямлі.

УПЯЛЕЙ (Уральская вобласьць), закраючы пытаньні землеўпарадкаваньня, разьіць дапамагаць заснаваньню на толькі буйных калектыўных гаспадарак, але дробных калектыўных гаспадарак. У некаторых райёнах аб'еднаньне ў калектыўныя гаспадарні на 7 і нават на 5 дворо ў вялікім крокам наперад у справе перабудовы сельскае гаспадаркі на больш высокую ступень развіцьця.

Новы закон аб землеўпарадкаваньні і землякарыстаньні,—гаворыць т. ПРЫШЧЭПАЎ (БССР)—у асноўным спатнаў поўную схвалу з боку шырокіх селянскіх мас і пэнсіялістаў Беларусі. Адная, асобныя артыкулы новага законаправэкту адчуваюць патрэбу ў некаторых нарэктывах. Між іншым, артыкул першы павінен быць зьмешчан у тым сэнсе, што ў выпадку незаконнае зьдзелкі, уласьнік пазбаўляецца не ўсяе свае зямлі, а толькі тае частки, на якую была незаконна ўчынена зьдзелка. Землеўпарадкаваньне,—зазначае далей т. Прышчэпаў,—павінна праводзіцца за кошт дзяржаўнага бюджэту. Толькі пры гэтай умове можна будзе праводзіць землеўпарадкаваньне ў шырокіх разьмерах і ў пажаданым напрамку.

ВАСІЛЮКАВА (Сібір) дамагаецца, каб у новым законаправэкце больш адбіліся інтарэсы батрацтва. Між іншым, павінен быць скарочан тэрмін, які дае права батраку на атрыманьне зямельнага надзелу.

У спрэчках у Савеце Нацыянальнасьцяў т. КАЦЁЛЬНІКАЎ (Башкірыя) адзначае, што землеўпарадкаваньне пасоўваецца слаба, а гэта тлумачыцца ў значнай меры платнасьцю землеўпарадкоўваючае працы. Яшчэ цяжэй з разьбіўкаю вучасткаў на палі севазвароту. Тут таксама ўстаноўлена плата. Загатны сяляне аддаюць перавагу праводзіць землеўпарадкаваньне самастойна і звычайна праводзяць яго направільна. Ад платы за землеўпарадкаваньне і за разьбіўку на палі севазвароту трэба сялянства вызваліць.

ТАВ. СТРОЕЎ (Малдавія) лічыць патрэбным да шэрагу артыкулаў закону, якія ўстанаўляюць парадак карыстаньня зямлёю маймаснага характару дадаць самацыі, караючыя за драпежніцкую эксплёатацыю вучастка. За гэта належыць надаць пазбавіць права карыстаньня зямлёю. Сельсаветам павінны быць нададзены больш шырокія гаспадарчыя правы, якімі пакуль карыстаюцца, галоўным парадкам, зямельныя грамады. Для ліквідацыі распыленасьці гаспадарак належыць увесьці пэўныя палёгкі для раопыленых гаспадарак, напрыклад, узмацненьне крэдыту больш буйным гаспадаркам.

Да зачыненьня пасяджэньня выказваюцца яшчэ 5 таварышоў. Асноўная думка выступленьняў зводзіцца да таго, што выданьне закону аб асноўных пачатках землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня зьяўляецца зусім своячасным, і што ў прынцыпе закон адпавядае асноўным патрабаваньням нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Усе таварышы адзначаюць тыя асобныя моманты асноўных пачаткаў якія, на іх думку, патрабуюць рэдакцыйных паправак. Працяг спрэчак пераносіцца на 10 сьнежня.

АГРЭСЫЎНАЯ ГУТАРКА ФОША САПРАЎДЫ МЕЛА МЕСЦА.

„ІНТЭРВ'Ю ФОША СЬВЕДЧЫЦЬ АБ ЗАВАСТРЭНЬНІ ІМПЭРЫЯЛІСЦКАЕ ПАГРОЗЫ ПРОЦІ СССР".

ШТО ПАКАЗАЎ НОВЫ ПРАЦЭС т. МАРТЫ.

ПАРЫЖ, 8-XII. Учора ў 12-й палаты парыскага апэляцыйнага суду разглядалася новая справа сябра ЦК французкае кампартыі Андрэ Марты. На сэсіі аз Марты абвінавачваўся „ў закліку а забойства". Прычынкаю для абвінавачваньня быў зьмешчаны ў «Юманіці» адказ Марты на вядомае інтэрв'ю маршала Фоша ў англійскім органе Рэфэры", з заклікам да інтэрвэнцыі проці СССР.

З прычыны таго, што вайсковы міністр Пэнлеве настойваў на несапраўдасьці інтэрв'ю Фоша, абаронцы Марты ажуліся ўстанавіць сапраўднасьць інтэрв'ю. Выкліканы абаронаю ў якасьці сьведкі галоўны рэдактар «Рэфэры» Брэстон заявіў на судзе: „Інтэрв'ю Фоша зьяўляецца сапраўдным. Яно было знята ў маршала за яго подпісам усім яломым і ні ў чым не западозраным лёндэнскім журналістам Дэйлі Хітботам, утарка з Фошам адбывалася ў прысутнасьці двух французкіх афіцэраў, прычым Фош асабіста даў тлумачэньні на свае заявы, адзначаючы розныя стратэгічныя пункты на геаграфічнай карце».

На запытаньне абаронцы Бэртана, ці прысылалася ў рэдакцыю «Рэфэры» якое-небудзь адхіленьне ў вязку з гэтым інтэрв'ю з боку Фоша ці французкага пасольства ў Англіі, Брэстон адказвае адмоўна.

Марты ў сваёй заяве зазначае, што інтэрв'ю Фоша сьведчыць аб завастрэньні імпэрыялісцкае пагрозы проці Савецкага Саюзу. «Калі,—заявіў Марты—французкі імпэрыялізм нападзе на СССР, дык партыя працоўных і ўсе працоўныя будуць абараняць СССР, як гэта гераічна зрабілі французкія маракі ў 1919 годзе».

У заключным слове Марты заяўляе „У адказе Фошу я назваў інтэрвэнцыю проці Расеі крывавым злачынствам Я не адмаўляюся ад ніводнага слова свайго адказу і калі-б мне давялося гэта зрабіць яшчэ раз, дык я зрабіў-бы».

НЕБЯСЬПЕКА ВАЙНЫ РОБІЦЦА РЭАЛЬНАСЬЦЮ.

АЦЭНКА МУСАЛІНІ СТАНОВІШЧА Ў ЭЎРОПЕ.

РЫМ. Італьянская палата дэпутатаў аднагодна зацьвердзіла законапраэкты аб партыі працы і вялікай фашысцкай радзе.

Мусаліні выступіў з вялікаю прамовою, якой падкрэсьліў значэньне зацьверджаных палатаю законапраэктаў. Мусаліні вялікую частку сваёй прамовы прысьвяціў замежнай палітыцы Італіі. „Увесь сьвет ужо ройвацца,—зазначыў ён,—гаворыць пішуць пра пабудову падводных лодак, крэйсэраў і іншых прыладаў на вайны. Вы, бясспрэчна, спачылі за прачкамі ў парляментах іншых краёў, а іх відаць, што яны гарматаў і штыкоў ня спушчае расьце. Ня трэба стварать сабе ілюзій канонт палітычнага становішча Эўропы. Калі бура набліжаецца, дык увесь сьвет гаворыць пра спакой і мір. Мы на ночам нарушаць раўнавагі Эўропы, але мы павінны быць гатовымі. Ніхто з нас ня зьдзівіцца і ніхто не павінен дзівіцца, калі я затрабую ад нацыі іншых патуг, каб паставіць на належную вышыню ўсе сілы мора, зямлі і неба (г. зн. сілы сухаземныя, марскія і паветраныя)».

ЛЁЙД-ДЖОРДЖ ПРАРОЧЫЦЬ БЛІЗКУЮ ВАЙНУ.

ЛЁНДАН, 9 XII. Адчыняючы кампанію лібэральнае партыі за мір, Лёйд Джарж учора ў Манчэстэры заявіў, што «з часу заснаваньня Лігі Нацый і падпісаньня Лёкарнскага ўгавору і пакту Келёга ўзброеньні нясупынна павялічваюцца. Калі народы ня згодзяцца шчыра і дабраахвотна мірнымі сродкамі разьвязваць канфлікты, дык толькі адзін бог можа выратаваць нас ад нянічасьця жахлівае вайны, якое яшчэ ніколі ня было».

Яшчэ адно банкроцтва разброеньня.

БЭРЛІН. Спэцыяльная камісія Лігі нацый, якой даручана выпрацаваць пазыцыю аб кантролі над вырабам вайсковых прыладаў і падаць яе разе Лігі, каб хутчэй склікаць міжнародную канфэрэнцыю, адклала сваю працу на невядомы час пасьля трохгодзённых нарад, якія скончыліся нічым. Спрэчнымі пытаньнямі, як і раней, застаюцца патрабаваньні Злучаных Штатаў, Нямеччыны і Галяндыі, каб кантроль не распаўсюджваўся на выраб камэрцыйных і транспартных самалётаў, а таксама, каб агаласіць абгрунтаваныя лічбовыя даныя аб выробе самалётаў.

ЗЬДЗЕК КЕЛЁГА НАД ПАКТАМ КЕЛЁГА.

ВАШЫНГТОН, 9-XII. Келёг заявіў у камісіі па замежных справах сэнату, што парыскі пакт не закранае дактрыны Монроэ і не ўскладае ніякіх абавязацельстваў на Зл. Ш.

ПАКТ КЕЛЁГА Ў СЭНАЦЕ ПАЗШ.

ВАШЫНГТОН, 5-XII. Прэзыдэнт Кулідж перадаў пакт Келёга ў сэнат з просьбаю зацьвердзіць яго ў бліжэйшы час.

Паліцыя ратуе Альбэра Тома ад рабочых.

ТОКІЁ, 6-XII. Прыехаў Альбэр Ома. Вакзал вартаваўся сотнямі паліцэйскіх; удзельнікі легга прафруху, якія раздавалі ў натоўпе лістоўкі проці Томс, прытоўваліся.

Згарэў праскі радыётэлефонны завод.

ВРАГА. 7 га лістапада пажарам зруйнаваны завод тэлефоннага і радыётэлеграфнага абсталяваньня ў Празе, які зьяўляецца філіялам стакгольмскага заводу Эрыксона. Страты дасягаюць 6-ці мілёнаў чэскіх кран.

КАТАРЖНЫ ПРЫСУД 29-ці ВІЛЕНСКІМ БЕЛАРУСАМ.

У Львове ізноў арыштавана 40 украінцаў.—Рабочыя Відзеўскае мануфактуры, абураныя здрадніцкімі паводзінамі ППС, разграмілі лодзінскі прафсаюз тэкстыльшчыкаў.

111 гадоў катаргі.

ВАРШАВА, 8-XII. У Віленскім акруговым судзе скончыўся працэс 29-ці абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі Заходняе Беларусі. 4 абвінавачаныя засуджаны на 7 гадоў катаржнага астрогу, 5—на 6 гадоў, 1—на 5 гадоў, 12—на 4 гады кожны; рэшта апраўдана.

* * *

Пасьля 2-тыднёвага разгляду справы 29-ці абвінавачаных у камунізьме, віленскі акруговы суд прыгаварыў:

Міцько Антона, Матусевіча Яна, Сырыда Язэпа і Божко Базыля—на 7 гадоў катаржнага астрогу;

Карпіновіча Паўла, Корсака Уладзіміра, Ліса Яна, Сабілло Антона і Бобра Сьцяпана—на 6 гадоў катаржнага астрогу;

Стайнбэрга Маўрыцыя—на 5 гадоў катаржнага астрогу;

Карпіновіча Міх., Габэлевіча Мац., Казла Сым., Маніта Баз., Сабілло Кір., Стаха Ульяна, Жукоўскага Юр., Кульбака Ант., Сідаровіча Мац., Жукоўскага Юст., Корсака Сід. і Ціўновіча Яна—на 4 гады катаржнага астрогу.

Іншыя абвінавачаныя апраўданы.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ЗАХ. УКРАІНЕ.

ВАРШАВА. 8-12. У зьвязку з замахам на рэдакцыю львоўскае газэты „Слово Польске і рэдакцыю краканўскае газэты «Курʼер Цодзенны», польская ўлада арыштавала больш 40 украінцаў, якія абвінавачаны ў прыналежнасьці да ўкраінскае вайсковае арганізацыі.

РАЗГРОМ РАБОЧЫМІ ЛОДЗІНСКАГА ПРАФСАЮЗУ

ЗА АДМОВУ ПРАФБЮРАКРАТАЎ ППС АЎЦАЎ АД ДАПАМОГІ САВЕЦКІХ ПРАФСАЮЗАЎ.

ВАРШАВА. Некалькі сот рабочых Відзеўскае мануфактуры ў Лодзі, якія яшчэ ня спыняюць да гэтага часу баставаць, сілаю захапілі памяшканьне лодзінскага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў, якім (саюзам) кіруюць пэпэсаўцы. Рабочыя хацелі наладзіць у памяшканьні прафсаюзу раздачу бастуючым дапамогі, атрыманае ад рабочых СССР, бо раздача дапамогі была перарвана арыштам стачачнага камітэту і зачыненьнем памяшканьня, у якім пасядаў стачачны камітэт. У памяшканьне прафсаюзу ўвайшло блізка 500 чалавек рабочых. Адпор, які спрабавалі даць рабочым пэпэсаўцы, выклікаў разгром рабочымі мэблі ў памяшканьні прафсаюзу і збойства сэкратара прафсаюзу пэпэсаўца Кшынуўку. На дапамогу пэпэсаўцам у памяшканьне прафсаюзу прыехала паліцыя, якая разагнала бастуючых.

Асноўнаю прычынаю гэтых падзей зьяўляецца абурэньне рабочых пасьля адмовы пэпэсаўскага прафсаюзу ўзяць грашовую дапамогу ад пралетарыяту СССР

Сьпешная прапаз'ція сойманай лявіцы.

Блёк сойманай лявіцы ўнёс гэтымі днямі ў сойм сьпешную прапазіцыю ў справе абежніка міністра ўнутраных спраў аб пасольскіх мітынгах, якія могуць цяпер адбывацца толькі з дазволу старасты.

Аб нацменскім школьніцтве.

Асьветная камісія сойму пачала 5 сьнежня г. г. разгляд прапазіцыі паслоў Украінскага ляюбу ў справе школ з украінскай, беларускай і літоўскай мовай выкладаньня. Прапазіцыя складаецца з 10 арт. і мае, свайю мэтаю замяніць закон ад 31 ліпеня 1924 г.

Забастоўка на электрычнай чыгунцы.

На электрычнай чыгунцы Варшава—Гродзіск выбухнула забастоўка. У адказ на гэта ўпраза электрычнай чыгунні звольніла ўсіх служачых чыгунні і хоча нанаць новых служачых.

Звальненьне эс-дэкаў з канцэнтрацыйнага лягеру.

Віленскія польскія газэты паведамляюць, што гэтымі днямі звольнены з канцэнтрацыйнага лягеру члены сацыял-дэмакратычнай партыі: Плявінскі, Клопмас і Пошкіс. Агулам знаходзіцца яшчэ ў лягеры 175 палітвязьняў—камуністаў і сацыял-дэмакратаў.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў НАВАГРАДЧЫНЕ.

Віленскія газэты паведамляюць, што на абшары Навагрудзкага, Палескага і Беластоцкага ваяводзтваў учынена апошнімі днямі шмат арыштаў. Раскансьпіравана 2 акруговых кам. КПЗБ, 7 райённых, 40 падрайённых, і каля 100 кам'ячэек. Агулам арыштавана 28 асоб, а за 16 разасланы даручэньні арыштаваць іх. Арышты адбываюцца далей.

Беларуская санацыя у новай ролі.

Збанкрутаваная беларуская санацыя ў Вільні, пацярпеўшы поўную няўдачу ў грамадскім жыцьці, знайшла новы спосаб змаганьня з прадстаўнікамі сялянска-работніцкай думкі. „Санаторы" распускаюць правакацыйныя чуткі аб розных здаронных з жыцьця і грамадзкай дзейнасьці гэтых прадстаўнікоў; чуткі ні на чым не абапёртыя, з мэтай панізіць і скампрамэтаваць гэтых прадстаўнікоў. Яны гэтыя чуткі пашыраюць і ў народ праз тыя асобы, якія прыяжджаюць у Вільню і, ня ведаючы сапраўднага твару здрадніку, заходзяць да іх на старой традыцыі. Аб'ектам нападак і подлых інтрыг стаўся асабліва пасол І. Дварчанін.

Канфіскацыя „Да Працы."

Па загаду гарадзкога старасты № 1 газэты „Да працы" сканфіскаваны за «Кутох Моладзі", а таксама за дзьво заметкі з палітычнай хронікі: «Нямецкая прэса аб украінскім руху ў Польшчы", і „Нямецкая нацыяналістычная прэса аб 10-цігодзьдзі польскае незалежнасьці."

Канфіскацыя „Жыця Люду."

Па загаду віленскага пракурора сканфіскаваны № 23 «Жыця Люду,» літоўскай газэты на польскай мове за шэраг артыкулаў быццам «антыдзяржаўнага зьместу.»

Вечарына Бутрыма і Калінoўскага.

1 лістапада ў залі Віленскай Бел. Гімназіі адбылася вечарына для ўшанаваньня памяці бел. паэты Бутрыма, у 100-ю гадавіну яго народзін, а таксама і Кастуся Каліноўскага, першага нацыянальнага змагара-рэвалюцыянэра за вольнасьць беларускага народу ў 1863 г., у 90-ю гадавіну яго народзін. Рэфэрат аб Бутрыме прачытаў гр. Антон Луцкевіч, а аб К. Каліноўскім—вучань Урбановіч.

Патранат пры гімназіі.

Пры Беларускім дабраадзейным таварыстве ў Вільні ўтварыўся школьны патранат для нагляду над школьнымі інтэрнатамі для вучняў і вучанік Віленскае Беларускае гімназіі. Старшыня школьнага патранату грам. Ф. Стэцкевіч, дырэктар гімназіі, сэкратар—грамадзянін У. Лукашэвіч.

У Саюзных Рэспубліках.

Пашырэньне Днепрастрою

МАСКВА. 8-XII Прэзыдыум ВСНГ СССР ухваліў на апошнім пасяджэньні некалькі пастаноў, якія ідуць на зацьверджаньне Савету Працы і Абароны, і каранным парадкам зьмяняюць далейшы ход працы на Днепрастрої. Пастаноўлена дазволіць кіраўніцтву будаўніцтвам абсталяваць станцыю дзесяцьцю агрэгатамі на 80 тысяч конскіх сіл замест запраэктаваных раней сямі агрэгатаў на 50 тысяч конскіх сіл, З ДАВЯДЗЕНЬНЕМ АГУЛЬНАЕ МАГУТНАСЬЦІ ДНЕПРАСТРОЮ ДА 800 ТЫСЯЧ КОНСКІХ СІЛ. У першую чаргу павінна быць устаноўлена 6 агрэгатаў, з іх 4 будуць заказаны заграніцаю, а 2—перададзены на савецкія заводы.

Ухвален разрахунак управы будаўніцтвам, што пры пашырэньні магутнасьці станцыі да 800 тысяч конскіх сіл кошт яе складае 220440 тысяч рублёў проці 213240 намечаных раней.

З прычыны вялікае патрэбы ў чорных мэталах, пастаноўлена ўкмочыць у пяцігадовы план разьвіцьця прамысловасьці пабудову новага мэталюргічнага заводу на Запарожжы, уключыўшы яго ў лік асноўных спажывчых энэргіі Днепрастрою Пастаноўлена таксама заснаваць паравы розэрў на Данбасе для Днепроўскае станцыі праз камбінаваную працу Дняпра з Данбасам. Дзеля гэтага павінна быць узмоцнена пабудова цеплавых электрацэнтраляў на Данбасе, маючы на ўвазе як задаволеньне ўласных патрэб басэйну, так і стварэньне розэрву для Днепрастрою.

Міліён гэкт. пад новыя калгасы

(Вынікі сэсіі савету Хлебацэнтру).

МАСКВА. Сэсія савету Хлебацэнтру, якая скочылася 7-га сьнежня, ухваліла пастановы па заслуханых дакладах. Савет ставіць задачаю Хлебацэнтру ў будучую хлебазагатоўчую кампанію давесьці таварную прадукцыю калгасаў да 833 тысяч тон, а звычайных выт ворчых аб'яднаньняў—да 500 тысяч тон.

Паваколо задач асеўных кампаній павінна быць мабілізава ўся каапэрацыйная грамадзкасьць. Кожная арганізацыя хлебнае сельска-гаспадарчае каапэрацыі павінна распрацаваць канкрэтны плян свайго ўдзелу ў асеўнай кампаніі і выканаць яго. Каб забясьпечыць правільны клясавы напрамак, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на падбор кіруючых кадраў ва ўсіх зьвеньнях хлебнае і сельска-гаспадарчае каапэрацыі. Плян будаўніцтва новых буйных збожавых калгасаў зацьверджан саветам на 1929 год на абшары ў 1 мілён гэктараў. Новыя калгасы павінны быць забясьпечаны належнаю колькасьцю трактараў (ня менш тысячы штук), а таксама кадрам агранамаў і арганізатараў.

Кулакі купляюць сабе галасы.

СЕВАСТОПАЛЬ. 6-12. Камісія ЦВК РСФСР, якая прыехала ў Крым для абсьледваньня савецкае працы і дапамогі ЦВК крымскае рэспублікі ў правядзеньні выбарчае кампаніі, аб'ехала горныя татарскія вёскі. Сябра камісіі т. Фрыдберг у гутарцы з супрацоўнікамі газэт паведаміў, што татарская вёска да перавыбараў надрыхтавана дрэнна. Актыўнасьць кулакоў вельмі вялікая. Яны склікаюць свае парады і ўсімі спосабамі імкнуцца перацягнуць на свой бок беднату. Выбрыты выпадкі подкупу: кулакі плацяць за голас да 10-ці рублёў. У некаторых вёсках у выніку няправільнае палітыкі мясцовае ўлады і ячэек здарыўся разрыў між беднатою і серадняками. Праца мясцовае выбарчае камісіі пры знана слабою.

4 новыя марскія лесавозы.

ЛЕНІНГРАД, 8-XII. Сёньня на Балтыцкім суднабудаўнічым заводзе пройдзена закладка 4-х новых марскіх лесавозаў: «Мікалаю», „Куйбышаў", «Молатаў» і „Бухарын". Кожнае з гэтых суднаў будзе мець грузаўздым у 3 з паловаю тысячы тоны.

Судны будуць пабудаваны на працягу 12-ці м.; столькі-ж часу будуюцца судны і на заходня-эўрапейскіх верфях

Тав. Розэнгольц—нам. Наркома РСІ СССР.

МАСКВА. 8-XII. Пленум ЦВК СССР зацьвердзіў т. Розэнгольца нам. Наркома РСІ СССР

Група трацкістаў на казанскай фабрыцы.

КАЗАНЬ, 10-XII. Абласная кантрольная камісія выкрыла антыпартыйную працу групы трацкістаў на адным з казанскіх прадпрыёмстваў—фабрыцы «Спартак». Кантрольная камісія ўстанавіла, што трацкісцкая група праводзіла пастаянную антыпартыйную працу і нелегальна распаўсюджвала трацкісцкую літаратуру. Кантрольная камісія ўхваліла выключыць з партыі 3-х чалавек (Суліну, Генсфат і Шнэйдэр) за фракцыйную працу, парушэньне пастаноў 15-га зьезду і ўпартае нежаданьне прызнаць свае памылкі. Некаторым таварышом пастаўлены ў віну іх прымірэнчыя адносіны да двейнасьці гэтае групы. Райкому прапануецца пашырыць выхаваўчую працу і кіраўніцтва парткалектывам на фабрыцы «Спартак».

Падхалімам ня месца на савецкай працы.

САРАТАЎ. Ніжня-Волская краявая КК зьняла з працы старшыню Саратаўскага гарадзкога савету Акімава, які выкарыстаў сваё службовае становішча дзеля асабістае мэты (пабудова на казённы кошт кватэры за 18 тысяч рублёў), а таксама дапусьціў падхалімства, безгаспадарчасьць і г. д.

Закупкі с.-г. інвэнтару заграніцаю.

МАСКВА, 5-XII. Скончаны закупкі заграніцаю сельска-гаспадарчага інвэнтару для патрэб веснавое засеўнае кампаніі. Будзе завезена 5.500 трактараў з прычэпным інвэнтаром, а таксама неабходная колькасьць мінэральных угнаеньняў. Першы параход з трактарамі вышаў з Нью-Ёрку ў канцы лістапада.

Мова буржуазных пісак пра СССР.

ПРЫКРЫВАЮЧЫСЯ Ў ЯКАСЬЦІ ДЫМАВОЕ ЗАСЛОНЫ ТАНЬНЕНЬКІМ ПАЦЫФІЗМАМ, ІМПЭРЫЯЛІСТЫ ЎЗБРОЙВАЮЦЦА ДЛЯ НАПАДУ НА САВЕЦКІ САЮЗ.

Выступленьне т. Варашылава на рабселькораўскай нарадзе.

МАСКВА, 7-XII. 7 сьнежня на нарадзе рабселькораў выступіў Варашылаў, які, між іншым, сказаў:

«У той момант, калі вы падрахоўваеце вынікі вашае працы за апошнія гады і намячаеце шляхі і сродкі, з дапамогаю якіх распачнеце новыя бойкі, вашы «сабраты» па пяру ў Заходняй Эўропе—буржуазныя журналісты ўсіх масьцяў—пішуць паклёп на нас, выдумляюць розную хлусьню пра Савецкі Саюз. У апошні час імпэрыялістычная прэса вядзе сыстэматычную кампанію хлусьні і паклёпу, спрабуючы давесьці, што СССР стаіць на шляху да развалу. Польская газэта «Слово» друкуе весткі аб нейкіх міфічных сялянскіх паўстаньнях у райёне Віцебску. Іншыя польскія газэты пішуць, што паўстаньні ахапілі ўсю Беларусь, што паўстаўшыя сяляне руйнуюць савецкія ўстановы, групуюцца ў партызанскія атрады.

Было-б паўбяды, калі-б буржуазныя прадажныя цісакі толькі адны ўдзельнічалі ў паклёпе на нас. Але справа стаіць інакей. Вы, мабыць, чыталі ў газэтах, як кіраўнік французкага ўраду Пуанкарэ ў адказ на выступленьне дэпутата Дэзаблена заявіў: «Урачыста абавязваюся ў той дзень, калі будзе даведзена, што вашыя савецкія прыцелі згадзіліся на ўсеагульнае разброеньне, пайсьці на іх прыкладу». Выступленьне Пуанкарэ вельмі характэрна. Пуанкарэ ня менш, чымся мы з вамі, ведае, што наш урад шчыра імкнецца да міру, вядзе палітыку міру. Пуанкарэ дасканала асьведамлен аб нашых прапановах у Жэневе наконт усеагульнага разброеньня, поўнага неадкладнага разброеньня. Пуанкарэ ведае, што яго ранейшы прадстаўнік у Лізе Нацый, прадажны сацыяліст Бонкур першы выступіў проці прапановы Літвінава і ня толькі проці праэкту поўнага разброеньня, але і проці прапановы аб частковым разброеньні. Пуанкарэ выступае ў хвілёю з прадажнаю зграяю буржуазных пісак. Наймныя пер'я паслужліва пішуць пад дыктоўку імпэрыялістаў, што СССР—вось хто зьяўляецца перашкодаю на шляху да разброеньня, што мы рыхтуем новую вайну і г. д.

Пуанкарэ, абвінавачваючы нас у адсутнасьці ціхамірліваньні, карыстаецца гэтым для павялічэньня ўзброеных сіл французкага імпэрыялізму. Вайсковы бюджэт Францыі непамерна раз ьше, французкая армія зьяўляецца самаю магутнаю ў Эўропе і, не зважаючы на гэта, яна на спыняе свайго росту, а ў 1930 годзе будзе больш армії 1914 году на 55000.

Гісторыя дала нам значны парыд нерацыцкі. Мы выкарысталі гэтыя гады, але трэба сказаць, што зрабілі далёка ня ўсё, што патрэбна для разьвіцьця народнае гаспадаркі і, асабліва, узм цненьня абароны.

У канцы т. Варашылаў зазначае на слабасьць рабселькораўскае працы ў галіне абароны і выказвае ўпэўненасьць, што якасьць гэтае працы пасьля нарады палепшыцца.

КАНТОНСКАЯ КАМУНА БЫЛА ЗАДУШАНА БУРЖУАЗЕЙ

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАНТОНСКАЯ КАМУНА!

Адозва выканкому МОПР'у.

МАСКВА. Выканком МОПР'у зьвярнуўся да ўсіх працоўных з адозвай да дню ўгодкі кантонскае камуны (1927-28 г. 11-га сьнежня). У адозве зазначана:

«Мінуў год з таго дню, калі над Кантонам узьняўся чырвоны савецкі сьцяг. Кантонская камуна пратрымалася толькі некалькі дзён. Пад ударамі контр-рэвалюцыйных банд Гаміндану, пры актыўным падтрыманьні імпэрыялістаў 13-га сьнежня загінула кантонская камуна. Суровым крывавым памінкі спраўляла кітайская буржуазея на руінах пераможанага Кантону, закрываўленых полымем «жывых факелаў» ад жыўцом спаленых рэвалюцыянэраў. Пяць тысяч рабочых засталі сваім целам вуліцы рэвалюцыйнага гораду і вяколіц, дзесяткі тысяч рабочых і сялян—старых, жанчын і дзяцей—цярпелі суровыя рэпрэсіі і аказваны былі на галадную сьмерць. Каты Гаміндану ня спыняюць сваёй нішчаднай вайны проці кітайскага народу. Сьмерць з настрымнаю сілаю ўсё яшчэ зьбірае ў гарадох і вёсках Кітаю сваё крывавае жніво. Толькі год мінуў з часу пераможы над Кантонам, і нудзныя лічбы 170 тысяч забітых, сотні тысяч параненых далучаюцца да бязьлічы ахвяр азьвярэлае буржуазеі і паспішчыны. Але кантонская камуна ня спыніла жыць у сэрцах мілёнаў кітайскіх пралетарыяў, зьяўляючыся крыніцаю натхненьня для новых барацьбітоў проці капіталу і імпэрыялізму".

„Павялічым матар'яльную і маральную дапамогу ахвярам белага тэрору ў Кітаі,—зазначана ўрэшце ў адозве—нападзім магутныя пратэсты проці крывавае расправы гаміндаўцаў і імпэрыялістаў".

АДЧЫНІЎСЯ VIII УСЕС. ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ.

Прадзьездаўскі пленум УЦСПС.

МАСКВА. 8-га сьнежня адбыўся перадзьездаўскі пленум УЦСПС. Пленум зацьвердзіў справаздачу прэзыдыуму УЦСПС да VIII зьезду прафсаюзаў і даручыў тав. Томскаму і Дагадаву зрабіць справаздачныя даклады на зьезьдзе.

Далей, пленум ухваліў адчыніць VIII усесаюзны зьезд прафсаюзаў 10-га сьнежня а 6-й гадз. увечары. Каб перадаць па радыё па ўсім СССР справаздачны даклад прэзыдыуму УЦСПС, пленум прызнаў патрэбным заслухаць гэты даклад на вячэрнім пасяджэньні 11-га сьнежня.

Нарэшце, пленум адназгодна зацьвердзіў кандыдатуру тав. Угланава на пасаду Народнага Камісара працы СССР.

Гвалт над харватамі.

ВЕНА, 8-12. Загрэбскі друк паведамляе, што белградзкі ўрад намеран перамагчы адпор харвацкае апазіцыі праз мілітарызаваньне адміністрацыі Харваты. Начальнікі цывільнае адміністрацыйнае ўлады ў харвацкіх акругах будуць заменены царскімі афіцэрамі (як зроблена ўжо ў Загрэбе, дзе прафэктам Загрэбскае акругі назначан артылерыйскі палкоўнік Максімовіч) Намечана частковая замена паліцыі сэрбскімі жандарамі. Начальнік жандармэрыі, які доўгі час быў на чале вайсковага кіраўніцтва ў сэрбскай Македоніі, назначан камандзірам загрэбскае дывізіі. Такім парадкам, жандармэрыя і армія Харваты зараз аб'яднаны пад агульным камандаваньнем.

Загрэбскае акруговае самакіраўніцтва прызнае незаконным і байкатуе новага прэфэкта палкоўніка Максімовіча. Загрэбскія газэты паведамляюць, што ўрад ухваліў прыстасаваць такое аб абароне дзяржавы проці сялянска-дэмакратычнае каліцыі.

РАЗРЫЎ МЭКСІКАНСКІХ ПРАФСАЮЗАЎ З УРАДАМ.

НЬЮ-ЁРК. 3 Мэксікі паведамляюць, што зьезд мэксіканскае федэрацыі працы ўхваліў зусім нарваць з урадам і павесьці барацьбу проці часовага прэзыдэнта Портэса Хіля. Зьезд адклікае ўсіх сяброў федэрацыі з ураду.

ФЭДЭРАЦЫЯ ПРАФСАЮЗАЎ ЗАКЛІКАЛА НАЦЫЮ ДА „РЭВАЛЮЦЫІ".

НЬЮ-ЁРК, 8-12. З Мэксікі паведамляюць, што на сёньнішнім пасяджэньні палаты прадстаўнікоў здарыліся незвычайна бурныя сцэны. Пасяджэньне прайшло пад знакам вострае барацьбы проці Маранэса і мэксіканскае федэрацыі працы. Адзін за адным шэраг прамоўнаў у вострых выразах накідаліся на Маранэса і яго арганізацыю. Каля памінкавыя парляменту жанчыны блізка 500 аграрыяў, якія настойвалі на патрабавалі ўпусьціць іх у палату. Яны кідалі ў памінкавае парляменту каменьні, навыбівалі шыбы і ўзь

КАНТОНСКАЯ КАМУНА.

(Да першай гадавіны кантонскага паўстаньня).

Контр-рэвалюцыйны пераварот у Ухане, які адбыўся летам 1927 году, зьмяніўся паваротным пунктам у кітайскай рэвалюцыі. Уся кітайская буржуазея і нават, гэтак званае, левае крыло Гаміндана канчаткова і безпаваротна перайшлі ў лягер рэакцыі. Гэтым самым задачы рэвалюцыйнай часткі кітайскага народу—пралетарыяту і сялянства сталі прасьцейшымі, меней складанымі, але-ж затое больш важнымі і неаслабнымі; біць ня толькі па імперыялізму ангельскаму, японскаму і амэрыканскаму, біць ня толькі кітайскіх фэадалаў і генэралаў, але паўстала ва кнейшая задача першачарговай ва тасьці—біць па сваей—кітайскай буржуазеі, змагацца з прадаўцамі кітайскай рэвалюцыі—з Гаміданам.

Уханскі пераварот не зламіў, ня прыглушыў барацьбы рабоча-сялянскіх масаў супроць імперыялістычна-фэадальна-буржуазнага блёку. Рэвалюцыйная барацьба пераходзіць у новую больш вышэйшую фазу свайго разьвіцьця. Часткі рэвалюцыйнай арміі робяць спробу арганізаваць рэвалюцыйныя сілы для таго, каб захапіць адну з правінцый паўднёвага Кітаю (паход у верхнім—кастрычніку на Гуандунь).

У шэрагу правінцый цэнтральнага Кітаю адбываюцца масавыя паўстаньні супроць памешчыкаў і гаміданаўскае ўлады. Ня гледзячы на белы тэрор, у гарадох пралетарыят ня спыняе барацьбы з рэакцыяй; наладжвае забастоўкі, якія часта пераходзіць у ўзброены наступ.

Кіраўніцтва рэвалюцыяй пераходзіць у рукі кітайскай камуністычнай партыі. Ужо 26-га лістапада Гуандуньскі камітэт ККП выдаў адозву, у якой заклікае рабочых і сялян да паўстаньня пад лёзунгамі:—«зямля сялянам», «хлеб рабочым», «далоў уладу гаміндану», «уся ўлада рабочым, сялянам і салдатам», „уся ўлада саветам". Калі агульнай прадумовай паўстаньня было—паслабленьне пануючых клясаў і ўзбурэньне народных масаў, дык непасрэдным штуршком да выступленьня паслужыла пагроза разбраеньня рэвалюцыйных палкоў, якія склалі галоўную вайсковую сілу кантонскага пралетарыяту.

Паўстаньне пачалося ў ноч з 10 на 11 сьнежня і дзякуючы выключнай харобрасьці паўстаўшых праз некалькі гадзін былі захоплены галоўныя пункты гораду.

Улада перайшла Савету Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў і яго ўрадаваму органу—Савету Народных Камісараў.

У напружанай узброенай барацьбе з наступаючымі сіламі контр-рэвалюцыі праходзяць тры гераічныя дні Кантонскай Камуны. Па прыкладу парыскіх камунараў пралетарыі Кантону затрымлівалі ў сьцен гораду ворага і пачыналі будаваць новае жыцьцё ў самім горадзе.

Першымі дэкрэтамі савецкага ўраду ў Кантоне былі: закон аб 8-мігадзінным рабочым дні, аб павышэньні заробчай платы, закон аб нацыяналізацыі зямлі і закон аб аналіраваньні ўсіх кабальных пазычковых і арэндных абавязацельстваў.

Першымі мэрапрыёмствамі рабоча-сялянскага ўраду былі: арганізацыя Чырвонай арміі, зацьверджаньне ўсіх заваёў ганконскіх забастоўшчыкаў і пастанова аб канфіскацыі дамоў буйнай буржуазеі ў карысьць працоўных. З турмаў было зволена 3400 палітычных вязьняў.

Існаваньне кантонскай камуны вылічваецца гадзінамі. Сьпіснутыя ў цесным коле трох дывізій, флёту і дэсантаў імпэрыялістых, рэвалюцыйныя пралетарскія атрады з цяжкасьцямі ў паходзе, заставіўшы шмат ахвяр, павінны былі пакінуць горад і падацца ў вёску. У апошняй таксама віпелі баі, але ня мелі магчымасьці паўстанцы-сяляне злучыцца з паўстаўшым пралетарыятам гораду. Гэта і было аднэй з галоўнейшых прычын падзеньня кантонскай камуны.

Паўстаньне кантонскага пралетарыяту ня было «путчам» наладжаным бальшавікамі, як спрабуе яго назваць уся буржуазея і яе лёкаі-сацыял-дэмакраты. Паўстаньне кантонскага пралетарыяту было вынікам разгортваньня клясавае барацьбы ў Кітаі, было вынікам нястрымнае энэргічнае барацьбы рабочых і сялян Кітаю за савецкую ўладу ў сваёй краіне. Кантонскае паўстаньне паказала, што вялікае клясавае змаганьне кітайскага пралетарыяту і сялянства ў далейшым могуць разгортвацца пад сьцягам барацьбы за ўладу саветаў, за рэвалюцыйную дэмакратычную дыктатуру рабочае клясы і сялянства.

Падаўленьнем кантонскага паўстаньня скончылася гераічнае змаганьне кітайскага пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства. Паслабілася толькі першая хваля рабоча-сялянскай рэвалюцыі, фізычна вынішчожана значная частка авангарду гэтай рэвалюцыі. Але нявырашанасьць галоўных супярэчнасьцяў, якія і парадзілі кітайскую рэвалюцыю, зьяўляецца асноўным фактарам, які паскорыць новы ўздым рэвалюцыі. Немагчымасьць вырашыць аграрнае пытаньне рэфармісцкімі мэтадамі, цяжкасьць выхаду з эканамічнага крызісу, узмацненьне эксплёатацыі і пагоршаньне эканамічных умоў шырокіх мас—вось умовы, якія зноў выклікаюць новы рэвалюцыйны ўздым.

За апошнія месяцы адбылося шмат буйных забастовак па ўсёй краіне. У шэрагу правінцый ня спыняецца магутны сялянскі рух. Неўраджай, даражына і голад яшчэ болей распальваюць рух стомленых мас і штурхаюць іх да новых рэвалюцыйных выступленьняў.

Барацьба кітайскага пралетарыяту зьяўляецца непасрэднай складанай часткаю барацьбы міжнароднага пралетарыяту супроць міравога імпэрыялізму.

Таму пралетарыі ўсіх краін сьвету пільна сочаць за новаўзрастаючымі хвалямі кітайскай рэвалюцыі і будуць сталую падрыхтоўку пад лёзунгам:—«на абарону кітайскай рэвалюцыі».

Гадавіна кантонскага паўстаньня будзе днём братэрскай салідарнасьці і сувязі пралетарыяту СССР і Захаду з прыгнечанымі рабочымі і сялянамі Ўсходу. Пры актыўнай дапамозе міравога пралетарыяту кітайская рэвалюцыя пераможа туземных і замежных прыгнятацеляў кітайскага працоўнага народу.

Ян—Лі.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

ГУЛЬНЯ ПУАНКАРЭ Ў «АПАЛІТЫЧНАСЬЦЬ».

ПАРЫЖ, 8-XII. „Рада міністраў ухваліла, што міністры павінны ў далейшым устрымлівацца ад удзелу ў зьездах і банкетах палітычных партый».

РАЗГРОМ ЧЭХАСЛАВАЦКАЕ КАМУНІСТЧНАЕ ПРЭСЫ.

ПРАГА, 6-XII. Улада забараніла на 6 месяцаў выданьне камуністычнага штотыднёвіка «Карпата - расейская Праўда». Суд зацьвердзіў загад улады замыніць штотыднёвы орган кампартыі у Славакіі. «Праўда».

КАНФІСКАЦЫЯ ОРГАНУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЁКУ.

ВЕНА. 6-12. Як паведамляюць з Бухарэсту, улада канфіскавала апошні нумар цэнтральнага органу рабоча-сялянскага блёку „Інаінто"—(«Наперад») за артыкул «Нахай жыве Савецкі Саюз». Адказны рэдактар газэты Дарынну аддадзен пад суд.

КАТАСТРОФА НА НАРВЭСКІХ НАФТАПРОМЫСЛАХ.

ОСЛО, 29-XI. Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „У Хрыстыяніі згарэлі прадпрыёмствы аб'яднанае нафтапрамысловае і прамысловае кампаніі. Страты ад пажару дасягаюць мілёну крон. Шмат рабочых спрабавала выратавацца ад агню праз вокны. 6 паранена. Аднаго рабочага да гэтага часу не знайшлі».

Вальдэмарас не падпісаў пратаколу.

Вальдэмарас не падпісаў пратаколу апошніх пасяджэньняў канфэрэнцыі ў Кёнігзбэрзе. З гэтай прычыны выехаў у Коўню нач. адзелу М. З. С. Пернаўскі, але так і не дачакаўся подпісаў, бо ў Коўні знайшлі, што польскі тэкст пратаколу ня зусім адпавядае прынятым пастановам.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Антысэміты ў Полаччыне.

ПОЛАЦАК, 10-12. Пры дапамозе мясцовай газэты выкрыт цэлы шэраг антысэміцкіх выступленьняў. Адным з абураючых вылазак антысэмітаў зьяўляецца выпадак, які меў мейсца пры пабудове новага маста.

Сярод рабочых былі варожа настроены супроць яўрэяў рабочыя Залескі і Карагін. Сваёй ахвярай яны абралі васемнаццацігадовую работніцу-яўрэйку Леню Каплан. Каплан штодзённа на кожным кроку чула зьдзекі і насьмешкі ад хуліганаў.

— Га, жыдоўская морда,—крычалі ёй хуліганы, нарыстаючыся тым, што іх ніхто ня спыняе ў іх дзеях. Залескі Карагін задумалі выкінуць «нявінную шутку" над т. Каплан. Свой намер яны ажыцьцявілі 30 лістапада. Калі Каплан была занята працай, хуліганы-антысэміты падыйшлі да яе—схапілі, палажылі на стол і гарачым сталярным лякам (разам з клеем) вымазалі ёй цела.

Падобным выпадкам узбурана ўсё насельніцтва Полацку. Трэба тэрмінова сюды ўмяшацца адпаведным арганізацыям і даць рашучы адпор варожай вылазцы.

Суд над хуліганамі павінен быць як мага хутчэй. Ёсьць яшчэ шмат амаль-што аналёгічных фактаў. Партыйныя і прафарганізацыі павінны зьвярнуць на гэта ўрэшце, увагу і пабудаваць вакол гэткіх выпадкаў грамадзкую думку.

Мік. С.

У дзень сьвяткаваньня агалашэньня Беларусі—адчыняецца электрастанцыя.

(Ліст з Мазыру).

Падрыхтоўка да правядзеньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня Беларусі адбываецца на Мазыршчыне побач з асьвятленьнем сярод шырокіх мас працоўных нашых дасягненьняў у нацыянальным, культурным і гаспадарчым будаўніцтве.

28 сьнежня—ва ўсіх гарадох, раённых цэнтрах і сельсаветах акругі адбудуцца ўрачыстыя сходы, прысьвечаныя сьвяткаваньню. Будуць праводзіцца вечары ўспамінаў, вечары змычкі рабочых з чырвонаармейцамі і будуць праведзены выезды шэфаў у падшэфныя вёскі.

Да часу сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя прыстасоўваецца адчыненьне шэрагу новых культурных устаноў, новых калгасаў, савгасаў, каапэрацыйных сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў.

У горадзе будзе праведзена адчыненьне новай электрастанцыі.

На ўсіх прадпрыёмствах, ва ўсіх установах і саюзах будуць выпушчаны спэцыяльныя нумары насьценгазэт.

У музэях акругі арганізуюцца аддзелы мясцовага рэвалюцыйнага руху. Утвораны камісіі па падрыхтоўцы да правядзеньня сьвяткаваньня на ўсіх прадпрыёмствах, у вайсковых часьцях і навучальных установах.

М. Гохфельд.

Акруговы зьезд рабселькораў.

Гомель, 10-XII. На 15-е сьнежня склікаецца акруговы зьезд рабселькораў. На зьезьдзе будуць 145 дэлегатаў. У сучасны момант ва ўсіх раёнах акругі праводзяцца раённыя зьезды рабселькораў. На раённых зьездах будуць даклады: перавыбары саветаў і задачы рабселькораў.

Кулакі сякуць лес мясцовага значэньня.

(Талочынскі раён).

Вёска Поўсьпіхава мае каля 25 дзесяцін лесу, якім распараджаецца, як сваёй уласнасьцю заможнае насельніцтва, а б дняк нават і ня сунься.

Некаторыя аб гэтым нібы ня ведаюць і не зварачваюць на гэта ніякае ўвагі, а лес з кожным днём пустошыцца. Сякуць хітра, як сьсякуць дрэва, зараз-жа разводзяць агонь, а потым пні і апальваюць.

Быў раз такі выпадак, калі бядняк нашоў, каб карчоў накапаць, дык гэтыя шкодлікі адабралі ў яго сякеру, а карчы сабе забралі. Вось якія выпадкі бываюць, і як кулак прыціскае беднату. Калі з надворнага боку паглядзець, дык адразу-ж можна даведацца, дзе бядняк жыве і дзе кулак. Бо кулак сячэ лес і будуе сабе моцную гаспадарку, а бядняк бяднеецца.

Пара ўжо бедняце прачнуцца і выйсьці з-пад уплыву кулака і шырока разгарнуць барацьбу са вынішчэньнем лесу.

Пятрусь.

Сяляне выказваюцца за самаабкладаньне.

(Самахвалавіцкі р-н., Меншчына).

Калі ў мінулым годзе праводзілася самаабкладаньне дык усе заможнікі раўлі, што гэта „падатак"; а калі ў вёсках сяляне ўбачылі карысьць гэтага, дык лічаць патрэбным ізноў праводзіць гэта мерапрыёмства ў жыцьцё.

На справаздачным сходзе, у в. Дубовы Лес, Кайкаўскага с-с., сяляне ў пастанове па справаздачы сельсавету выказалі згоду аб правядзеньні паўторнага самаабкладаньня дзеля скончэньня будынку над хату-чытальню.

На шэрагу іншых вёсак як Астравы, Бардзілаўка, сяляне выказваюць думку аб правядзеньні паўторнага самаабкладаньня, гэта паказвае, што кулацкая хлусьня не апраўдала таго, што яны думалі.

«Лёгкі».

Калектывізуемся.

(В. Лапіроўшчына, Ляднянскі р.).

Улетку гэтага году ў в. Лапіроўшчына агранам праводзіў сход да пераходу ад трохполкі да буйнай калектыўнай гаспадаркі. Сяляне ўважліва праслухалі лекцыю агранома і потым 9 бядняцкіх гаспадароў парашылі арганізаваць калектыў. Ім далі кавалак зямлі, дзе ўжо будуюць памяшканьні. З ужо пабудавалі памяшканьні і жывуць. Працуюць разам.

Набылі машыну малатарню, спружынавую барану, прывод і веялку.

Засадзілі 3 дзесяціны садам, дзе пасадзілі 400 дрэў.

Прыклад другім калектывам. К.

Выканалі 80 процантаў заданьня.

(Жлобінскі раён).

Майскае аддзяленьне Жлобінскага спажывецкага таварыства, ня гледзячы на тое, што знаходзіцца ня ў вельмі хлебным раёне, загатовіла на 1-е сьнежня больш чым 900 пуд. розьнага збожжа, што складае каля 80 проц. заданьня.

У гэтай справе трэба адзначыць, што ваколічнае насельніцтва добра ўразумела сэнс загатоўкі і таму кожны імкнецца здаваць сваё збожжа праз каапэрацыю.

Наогул загатоўку Майскага аддзяленьня трэба лічыць лепшай ў раёне.

Слупскі.

Адчыняецца савецкая чайная.

(Віцебск.)

Паводле пастановы гарсавету ў Віцебску было зачынена 14 піўных крам. Аб адчыненьні савецкай чайнай ня было і гаворкі. У Віцебску існуюць на кожным рынку па 2-3 прыватных чайныя, дзе была паўнейшая антысанітарыя. Апроч таго, у прыватных чайных меліся ў прадажы і піва і гарэлка.

Гэтыя чайныя патрэбнасьць сялян не здавальнялі, бо былі высокія цэны і заўсёды было поўна п'яных.

Гэтымі днямі ў Віцебску адчыняецца першая савецкая чайная ў цэнтры гораду, дзе раней была піўная крама. Рамонт савецкай чайнай ужо скончан. Рабочы знойдзе там адпачынак. Неабходна, каб ВЦРК адчыніў чайныя і на рынках, дзе сяляніи прачытае газэту і часопіс і атрымае чысты чай.

Віцебскі.

10 тыс. рублёў на барацьбу з дзіцячай бясспрытульнасьцю.

Гомель, 8-XII. Цэнтральная камісія ЦВК БССР дапамогі дзецям асыгнавала для Гомельскае акруговае камісіі дапамогі дзецям 10 тысяч рублёў на ўзмацненьне барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю ў акрузе.

Частка сродкаў будзе выкарыстана на закупку цёплага адзеньня бясспрытульным дзецям, а частка сродкаў на пашырэньне вытворчых прадпрыёмстваў.

Падрыхтоўка кваліфікаванай сілы для прамысловасьці.

Адпушчаны вялікія сродкі на арганізацыю школ ФЗУ.

У сёлетнім гаспадарчым годзе ВСНГБ адчыняе 3 школы фабрычна-завадзкога вучнёўства. Адна ў Віцебску па апрацоўцы мэталю на 50 чалавек вучняў. Другая ў Бабруйску па апрацоўцы дрэва на 40 чал. Прычым, для гэтай школы будуецца спэцыяльны новы будынак пры дрэваапрацоўчым камбінаце коштам у 80.000 рублёў. Трэцяе ў Менску па вывучэньні гарбарна-абутковага рамества. На гарбарнай спэцыяльнасьці, на 30 чалавек, адчыняецца 15 студзеня 1929 году, а па абутковай, на 40 чалавек—у верасьні 1929 году.

Пры прыёме вучняў у гэтыя школы будзе праводзіцца прафэсыянальны адбор іх і ў далейшым школы ФЗУ будуць укамплектоўвацца вучнямі з асьветаю ня менш 7-мігодкі.

Прыём вучняў у новыя школы ФЗУ будзе адбывацца за рахунак адпаведнага скарачэньня колькасьці броні на прадпрыёмствах.

На арганізацыю школ ФЗУ адпушчаны значныя сродкі; так, для мэталічнай прамысловасьці—18.000 руб., гарбарнай—10.000 руб. і дрэваапрацоўчай—17.500 руб. Прычым, гэтыя сродкі пойдуць выключна на вытворчую адукацыю, утрыманьне і на падручнікі. На аплату вучняў вызначаны асобныя сродкі.

Групе эканомікі працы пры ВСНГБ запрапанавана распрацаваць праэкт арганізацыі школы ФЗУ будаўнікоў у Менску на 40 чалавек і шэйнікаў на 50 чалавек.

Вясною 1929 году мяркуецца адчыніць у БССР паказальны торфараспрацоўчы вучастак, які будзе мець таксама характар падрыхтоўкі кваліфікаваных тарфянікоў. На вучастку будзе весьціся 3-хмесячная праца вучнямі ў агульнай колькасьці 180 чалавек (120 мужчын і 60 жанчын). Паказальны вучастак будзе камплектавацца выключна мясцовою моладзьдзю.

Утрыманьне вучастку будзе каштаваць 55.000 рублёў у год, аднак, за прадукцыю, якую вучні выпрацуюць за сэзон, ВСНГ мяркуецца выручыць 38.000 руб.

Апроч таго, Белторфу запрапанавана арганізаваць курсы на падрыхтоўцы кваліфікаванай сілы для заводаў па вырабу з торфу падсьцілачнага і ізаляцыйнага матар'ялу.

У Гомелі будуецца вялікі інтэрнат для вучняў ФЗУ, на які адпушчана 120.000 руб. Будынак будзе скончан сёлета.

Падрыхтоўка да 10-цігодзьдзя БССР.

Менская акруговая камісія па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя БССР заслухала 8 сьнежня шэраг дакладаў розных арганізацый і ўстаноў аб падрыхтоўцы да сьвята.

Прадстаўнік Белдзяржкіно тав. Матусаў далажыў акруговай камісіі, што ў сьвяточныя дні ў кіно-тэатрах Менску будуць дэманстравацца кіно-фільмы вытворчасьці Белдзяржкіно дарэмна для ўсіх жадаючых. Будуць дэманстравацца выключна фільмы, якія зьняты з беларускага жыцьця. Мяркуецца прапусьціць звыш 4 з паловаю тысяч чалавек. Вырашаецца пытаньне аб дэманстрацыі кіно-фільмаў дарэмна ня толькі днём, але і вечарам у сьвяточныя дні.

Апроч таго, на Пляцу Волі будзе ўстаноўлен апарат, праз які таксама будуць прапушчаны некаторыя фільмы.

Рыхтуецца фільм па твору Якуба Коласа «На прасторах жыцьця», які мяркуецца паказаць першым чынам на ўрачыстым пасяджэньні Сэсіі ЦВК БССР.

Камісія запрапанавала Белдзяржкіно скласьці фільм „кіно-хроніка", які-б характарызаваў дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве за 10 год.

З дакладу тав. Сэляха аб тым, як рыхтуецца да сьвята БДТ1, відаць, што апрацоўваецца першая беларуская опэра „Тарас на Парнасе", якая мае быць наладжана сіламі Музычнага Тэхнікуму.

Ладзіцца канцэртны вечар з вялікаю спэцыяльнаю праграмаю.

Паасобныя артысты і групы артыстаў будуць выступаць у рабочых клюбах.

Магчыма, што да сьвята будзе падрыхтавана новая п'еса Рамановіча—«Мост», якая характарызуе дасягненьні ў галіне індустрыялізацыі.

У м. Койданаве адчыняецца помнік барацьбітам рэвалюцыі; прыстасоўваецца адчыненьне цагельні ў Дзягільне; ва ўсіх 7-мігодках раёну вылучаецца па адной ступэндыі для вучняў; адчыняецца новы смалакурна-шыгінарны завод; у Вертніках адчыняецца польская хата-чытальня; на сьвята ў РВК запрашаюцца рабочыя з г. Менску і сяляне з самых далёкіх вёсак раёну.

Па лініі акруговай сэкцыі калектыўных гаспадарак праводзяцца наступныя мерапрыёмствы:

Падрыхтоўваецца адчыненьне 4 дзіцячых ясьляў у сельска-гаспадарчых камунах; ва ўсёй акрузе па калгасах мяркуецца ўстанавіць 12 гучна-гаварыцеляў; у с.-г. камуне «Чырвоны Кастрычнік» адч няецца чырвоны куток; у Капыльскім і Пухавіцкім раёнах мяркуецца прыстасаваць да сьвят адчыненьне дзьвёх калектыўных гаспадарак.

Па прапанове акруговай камісіі прымаюцца крокі да папулярызаваньня праз друк, радыё і інш. ідэй калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Шмат мерапрыёмстваў робіцца і па лініі іншых устаноў, як, напрыклад, Белкаапсаюзу, акруговай інспэкцыі працы, ЦРК і вайсковых частак.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ Ў БССР ІНСТЫТУТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Буйны тэмп росту нашай прамысловасьці і вызначаныя ў гэтым годзе вялікія будаўнічыя работы, асабліва новае капітальнае будаўніцтва, ставяць перад прамысловасьцю БССР задачу падвядзеньня навуковай базы і скарыстаньня апошніх дасягненьняў навукі і тэхніці ў гэтым будаўніцтве. У сучасны момант, у сувязі з гэтым, перад прамысловасьцю БССР з усёй сур'ёзнасьцю паўстала пытаньне аб арганізацыі Беларускага Навуковага Дасьледчага Інстытуту Прамысловасьці.

Задачай гэтага інстытуту, які павінен будзе аб'яднаць дзейнасьць шэрагу органаў, якія займаюцца вывучэньнем прамысловасьці, павінна быць сыстэматычнае і ўсебаковае вывучэньне розных частак прамысловай гаспадаркі, сыравінных і энэргетычных рэсурсаў.

Вывучэньне гэтых праблем павінна адпавядаць аб'ёму індустрыялізацыі БССР. У сувязі з пастаўленымі задачамі ў галіне тэхнікі і эканомікі Інстытут Прамысловасьці павінен мець і адпаведную структуру. Па думцы ВСНГБ інстытут павінен мець наступныя аддзелы: мінэральнай тэхналёгіі; горна-прамысловых досьледаў; энэргетыкі; тэхналёгіі дрэва, мэталу; леса-торфа-хімічны; тэхналёгіі валакністых матэрый; аддзел рэаапрапоўкі сыравіны ад жывёлагадоўлі; харчавы; штучных угнаеньняў; хэміка-фармацэўтычны; эканоміі прамысловасьці і агульны аддзел з пад'аддзеламі: рацыяналізацыі, стандартызацыі і вынаходзтва.

Пры інстытуце павінна будзе знаходзіцца цэнтральная лябараторыя з адпаведнымі аддзяленьнямі. Адчыненым засталося пытаньне адносна арганізацыі ў складзе інстытуту прамыслова мастацкага аддзелу.

Кіруючымі органамі Інстытуту Прамысловасьці будуць зьяўляцца дырэкцыя і савет. Апошні складаецца з прадстаўнікоў розных навуковых арганізацый, Дзяржпляну і міжаузнага бюро інжынэрна-тэхнічнай сілы.

Цікава адзначыць, што для больш цеснай сувязі інстытуту з прамысловасьцю, і грамадзка-вытворчымі арганізацыямі мяркуецца ўстанавіць членства і карэспандэнцтва. Членамі і карэспандэнтамі інстытуту будуць як розныя асобы, якія працуюць у прамысловасьці, так і вытворчыя нарады і кантрольныя камісіі, якія вызначаны заслугі ў галіне прамысловасьці ў рабочага вынаходзтва, або дапамагалі інстытуту карыснай працай.

Пытаньне аб арганізацыі Інстытуту Прамысловасьці ВСНГБ у хуткім часе ўносіць на разгляд СНК БССР і накіроўвае на заключэньне ў Галоўнавуку, Дзяржплан і Акадэмію Навук.

С. Азерскі.

У дапамогу шэфтаварыствам.

У практыцы працы шэфства над вёскай прыходзіцца сустракацца са зьявішчамі, якія значна перашкаджаюць пашырэньню гэтай працы, паглыбленьня зьместу яе для таго, каб скласьці бядняцка-сераднякі блёк па культурнаму выхаваньню сялянства і культурнаму ўздыму сельскае гаспадаркі.

Па адзін раз партыйныя органы давалі дырэктывы аб палепшаньні, узмацненьні савецкага і каапэрацыйнага апарату на вёсцы, як асноўнага зьвяна, якое ў першую чаргу павінна дапамагчы ў шэфпрацы.

Гэту задачу, па пастаноўцы на належную вышыню работы савецкага і каапэрацыйнага апарату на вёсцы, можна ажыцьцявіць у тым выпадку, калі ў работу шэфаў будуць уцягнуты рабочыя масы і ўвесь актыў.

Да гэтага часу ў рабоце шэфаў прымалі слабы ўдзел партыйныя і камсамольскія ячэйкі. А калі гаварыць пра прафэсыянальныя арганізацыі, то апошнія ўва многіх выпадках абмяжоўваліся заслухоўваньнем справаздач шэфтаварыстваў.

Дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб «неабходнасьці зьдзейсьненьня непасрэднай сувязі гарадзкіх ячэек пралетарскай грамадзкасьці з вясковымі» надзвычайна важна, таму прафэсыянальным арганізацыям з наступленьнем новага каштарыснага году неабходна пабудаваць пляны сваёй працы так, каб усю сваю культасьветную працу ўвязаць з працай шэфтаварыстваў.

Трэба ў каштарысах будучага году ўсім нізавым прафарганізацыям прадугледзець выдпуск сродкаў для арганізацыі ў кожным рабочым клюбе перасоўкі-бібліятэкі для вёскі. Трэба прафарганізацыям мець некаторы фонд для таго, каб даць мажлівасьць пабываць бедняку - селяніну на прадпрёмстве, азнаёміцца з ім, з жыцьцём рабочых, з нашым будаўніцтвам, каб пазбавіцца розных размоў, што падаткі ідуць на «галіфэ» для рабочых.

Рабочая маса з усімі сваімі арганізацыямі павінна даць належны адпор кулаку праз складаньне бядняцка-сераднякага блёку супроць кулака, на чале з рабочай клясай. Гэта можна зьдзейсьніць у тым выпадку, калі будзе аказана належная дапамога шэфтаварыствам з боку прафарганізацый як сродкамі, так і іншымі культурнымі мерапрыёмствамі. Д. Маркаў.

КАНТОНСКАЯ ТРАГЭДЫЯ.

(Да гадавіны кантонскага паустаньня 11-га сьнежня).

Артыкул былога консула СССР у Кантоне тав. Пахвалінскага.

Паўстаньне адбылося ўноч на 11-га сьнежня 1927 г. Гадзіны ў тры раніцы мы былі абуджаны моцваю кулямётнаю і гарматнаю стральбінаю, якая з тэй хвіліны амаль ня сьпіхала на працягу трох сутак. Цэнтр падзей быў у горадзе, там былі згрупаваны ўсе сілы паўстаўшых. Туншан-жа (прыгарад Кантону), дзе знаходзілася савецкае консульства, быў прадастаўлен самому сабе: старая палічная зьнікла, патрулі і аўтамабілі з чырвонагвардзейцамі час-ад-часу зьяўляліся толькі ўдзень; уначы-ж ня было ніякай варты. Гэтым скарыстаўся крымінальны элемент і пачаў рабаваць. Кожную ноч мы чулі лямант рабуемых і забіваемых; стральбіна ня спынялася.

Звычайны бандыцкі наскок награжаў і консульству. Мы ўжылі меры да самаабароны. Пры консульстве жылі—я з сям'ёй, віцэ-консул Хассіс і сэкратар Уколаў з сям'ёй. Рэшта супрацоўнікаў жылі ў другім доме. Яны пакінулі свае кватэры і перабраліся таксама ў консульства. Узброіліся, хто чым мог: у каго быў браўнінг, у каго бульдог, а ў аднаго таварыша знайшоўся нават вялікі маўзэр—і ноччу пазьменна вартавалі.

Уноч на 13-га сьнежня, перад раніцай, стральбіна пачала сьціхаць—рэвалюцыйнае войска адступала з гораду.

Каля 10-й гадзіны раніцы міма консульства прайшоў з Туншана ў горад вялікі атрад рэгулярнага войска. Іх белыя гальштукі, якія былі ва ўсіх чыста салдат, красамоўна гаварылі аб лёсе паўстаньня.

Адразу-ж пасьля гэтага вуліцы ў Туншане ажывіліся: зьявіўся звычайны кітайскі тлум, з тэю толькі розьніцаю, што амаль усе нелі на шыі белыя гальштукі.

Мы назіралі гэты натоўп. На нашых-жа вачох гэтыя людзі арганізаваліся ў атрады, але толькі ўжо белыя, і беглі ў горад, каб далучыцца да тэй агіднай расправы, якая адбывалася там.

А аб тым, што там рабілася, мы ўжо добра ведалі. Якраз перад самым консульствам адна з груп белагальштучнікаў злавіла рабочага, які не пасьпеў ці не пажадаў зьняць свайго чырвонага гальштука. Яго зьвязалі, доўга білі і на вуліцы-ж напроці консульства расстралялі. У працягу дня былі яшчэ два такія здарэньні, і гэтыя тры трупы так і ляжалі ўвесь дзень каля нас.

Пасьля сёмай гадзіны вечара, як звычайна, мы сабраліся ў агульным пакоі, які знаходзіўся ў віжэйшым паверсе, вячэраць.

Раптам прыбег са двара дзяжурны кітаец і паведаміў, што мы абкружаны салдатамі.

Ля кратчастай брамы шалеў натоўп узброеных салдат. Лоў—кітаец, супрацоўнік консульства, які ведаў ангельскую мову, растлумачыў, што яны патрабуюць адчыніць браму. Я спрабаваў праз Лоў гаварыць з заўважаным ля брамы афіцэрам. У адказ былі дзікія вокрыкі, пацэляныя маўзэры і загад адчыніць браму.

Натоўп рынуўся з шалёнымі крыкамі. Мяне схапілі, абшукалі, выцягнулі ўсё з кішэняў і зьвязалі назад рукі. Зьнялі акуляры і гэтым канчаткова абляброілі; я ўжо ня бачыў што робіцца ў консульстве. Потым выправадзілі мяне на вуліцу, паставілі да процілеглай сьцяны, вакол расчысьцілі месца; атрад салдат па загаду нацэлілі на мяне вінтоўкі. Была поўная інсцэніроўка расстрэлу.

Аказалася, што гэта быў спосаб пазбавіць мяне магчымасьці „ўцячы". Ля сьцяны трымалі нядоўга, зьвязалі яшчэ ўсіх па-пары, працягнулі праз усе пары доўгі шнур і пагналі ў горад.

Ішлі мы пяшоўга. За паўвярсты ад консульства знаходзіцца вялікі Захолні Пляц. Лоў, які быў зьвязан са мною ў аднэй пары, тлумачыў мне гутарку салдат, што нас вядуць на расстрэл. Але да самога пляцу мы не дайшлі. Вакол гэтага пляцу разьмешчаны шматлікія вайсковыя ўстановы—штабы, казармы—і нас прывялі да штабу аднэй дывізіі. Тут нас адвязалі адзін ад другога, а пасьля пачалі разьвязваць і кожнага ўпаасобку, але для таго, каб замяніць салдацкія паскі, якімі мы былі зьвязаны каля консульства, спэцыяльна вынесенымі з штабу вяроўкамі. Зьвязвалі дзіка, груба закручваючы рукі назад, алеасабліва «пашчасьлівілася» мне і нябожчыку т. Іванову. Нас зьвязалі першымі і выправадзілі ў перадпакой штабу. Да нас падышоў нейкі чын, абмацаў нашы вяроўкі і, званошучы, што мы, вельмі слаба зьвязаны, пікнуў нагой салдата, што нас зьвязваў і загадаў другому перавязаць. Востры боль у руках паказаў, што салдат добрасумленна выканаў загад.

Пасупроць уваходу ўзвышалася нешта накшталт эстрады, у аршын вышыні, агароджанае жалезнымі кратамі. Нас увялі на гэтую вышку і пачалі грубымі штуршкамі падганяць да аграды і канцамі вяроўкі прыкручваць да кратаў, моцна закручваючы некалькі разоў вяроўкаю грудзі. Потым моцна і балюча сьцягнулі кожнаму ногі. Некаторым да гэтага ўсяго (усім кітайцам, Макараву і Папову) перакінулі вяроўку вакол шыі і моцна прыцягнулі галавы да кратаў, ад чаго цяжка было дыхаць.

Тут, ля кратаў, я толькі змог аглядзецца і падлічыць, хто са мною. Тут было амаль усё консульства: віцэ-консул А. І. Хассіс, сакратар В. А. Уколаў, шыфравальшчык Ф. І. Папоў, перакладчык П. І. Макараў, дзелавод К. С. Іваноў, машыністка Н. М. Кульчыцкая, мая жонка А. Д. Пахвалінская, дачка Сьвятлана 5 гадоў, жонка Уколава—М. Н. Уколава з дачкою Эдаю 2-х гадоў і жонка другога сэкратара—Г. М. Бэрман.

З кітайцаў былі: Лоў, начны вартаўнік, вур'ер консульства А-Ва, садоўнік Ло, кухар Ван, памоцнік Ван, памоцнік кухара, хлопчык 11-цігадоў, Хін і нянька маёй дачкі Вонг.

Так мы прасядзелі ўсю ноч.

Памятаю асабіста па сабе, якіх шалёных стараньняў каштавала мне, каб ня крычаць ад болю. Увесь час я пакрываўся халодным потам. Ад болю траціў прытомнасьць, ад болю-ж ачуняў, тады біўся галавою аб жалезныя краты, каб хоць другім болем як-небудзь заглушыць шалёны боль у руках. Але канца ночы я наогул ня памятаю. Ачнуўся я ўжо раніцою. Было зусім відна, гадзін 8 раніцы. Па просьбе сядзеўшых з намі кітайцаў вартаўнікі пачалі нас па чарзе разьвязваць і вадзіць за патрэбаю.

Калі салдат разьвязаў мяне, дык устаць я мог толькі пры яго дапамозе і ледзь трымаўся на нагах. Рукі былі сіня-белыя, вельмі спухшыя, з вялікімі пузырамі на тых мясцох, дзе былі вяроўкі. Сьлады гэтых пузыроў засталіся, мабыць, назаўсёды. Доўга пасьля гэтага я ня мог падняць рукі і надоўга страціў здольнасьць адчуваць канцамі пальцаў.

Пасьля нас прывялі назад і зноў пасадзілі на райнейшае месца, але прывязалі ўжо слабей і толькі за прадплечча. Рукі былі вольнымі і, такім чынам, дванаццаці гадзінныя пакуты былі скончаны.

Тут я зноў пачаў патрабаваць тлумачэньняў ад кожнага падыходзячага да нас афіцэра. Усё было дарэмна: гутарыць з намі ніхто не хацеў.

Нарэшце, гадзіне а 10-й да нас падышла група афіцэраў, і старэйшы з іх, у форме палкоўніка, зьвярнуўся да нас на ангельскай мове з прапановаю паведаміць нашы прозьвішчы. Мінула я

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

ПРЫРОДАЗНАЎСТВА---ВОРАГ РЭЛІГІЙНАСЬЦІ.

Самым моцным спосабам барацьбы з рэлігійным дурманам выяўляецца належная пастаноўка выкладання фізыкі і прыродазнаўства з хэміяй у сяміг одовых школах, большае пашырэньне гэтых ведаў у пачатковых школах і вынясеньне лекцый з досьледамі па фізыцы і хэміі па-за сьцены школы ў масы насельніцтва.

Супроць тых вынікаў, якія дае любы досьлед па фізыцы ці хэміі; нічога ня зробіць с а м ы заядлы поп. Усё робіцца на вачох прысутных, кожны можа бачыць уласнымі вачыма і прылады, і матар'ялы, і таго, хто робіць досьлед. Няма «божественной» тайны, няма «цуду», усё так проста і так натуральна.

Здабываньне вады, электрычнасьці, пераганьне вады, здабываньне розных газаў і досьледы з імі, электрычная іскра і шмат іншага,—усё можа зрабіць прадметам лекцый сярод дарослых. Добра даглядженны, сад, гарод, поле пры школе (а гэта справа прыродазнаўча)— самы лепшы адказ на тое, што роля бога ў жыцьці чалавека ня мае ніякага значэньня, што царква, папы, рабіны і інш. прыхільнікі яго толькі зьбіваюць з толку. А калі так, калі мы самі г спадары жыцьця пры належным знаёмстве з законамі прыроды, дык няма нават і самага бога.

Шэраг такіх ілюстраваных досьледаў лекцый дасьць лепшыя вынікі, чымсь шмат дакладоў на антырэлігійныя тэмы. Але гэтым не адхіляецца роля і дакладаў, ба на ўсё магчыма правесьці перад сялянствам на досьледах.

Адкуль узяць сродкі на правядзеньне такіх лекцый і хто іх будзе рабіць? Такое пытаньне разьвязаць вельмі проста. Кожная сямігодка ў райёне атрымлівае на бюджэту грошы на фізычны і хэмічны габінет. Калі належным чынам арганізаваць габінэты, дык заўсёды знойдуцца і матар'ял і прылады. Пашырэньні лік бібліотэчнікаў па райёне, магчыма дабыць частку сродкаў і на-за школай. Сілы ёсьць—настаўніцтва. Настаўніцтва і першы начын павінны ўзяць на сябе адказ ведаў выкладчыкі сямігодак. А там да іх далучацца васковыя настаўнікі.

Сярод вучняў сямігодак пашыраецца праца паставіць лягчэй. Яны працуюць у адным месцы, маюць настаўнікаў, часта асобны пакойчык для габінэтаў. Але, на вялікі жаль, у гэтым напрамку робіцца вельмі мала. Часта прылады па фізыцы застаюцца ў шафах і пакрываюцца пылью, псуюцца хэмічныя рэактывы, пасуда, мікраскопы не скарыстоўваюцца, зоолёгія, батаніка праходзіцца «адгэтуль да гэтуль», аб працы ў садзе, гародзе толькі думаюць.

Часта перашкаджае працы і іншае: адсутнасьць сродкаў на прылады, пакою для працы, вялікая адлегласьць ад гораду. Часта прыходзіцца толькі паказаць прыладу, а ня досьлед, бо прылада папсаваная. Самы досьлед вывучаецца па книжцы. Нават і пры наяўнасьці ўсяго патрэбнага многага ня зробіш, бо вучні старэйшых груп перагружаны, а па фізыцы, прыродазнаўству так вялік курс, што калі рабіць шмат досьледаў ды яшчэ экскурсій, дык курс застанецца ня пройдзеным. Але самае неабходнае магчыма распрацаваць на досьледах.

У даным напрамку неабходна надкавацца і самім выкладчыкам. Навейшая літаратура, бібліяграфія павінны быць у школьнай бібліятэцы, бо бяз гэтага далёка не паедзеш. Павінны быць і практычныя дапаможнікі дзеля абсталяваньня габінэтаў і майстэрні. Патрэбна і мэтадычная і папулярная літаратура.

Васковыя школы павінны набыць тэрмометры, ртутны барометр, які магчыма зрабіць самім, маючы шкляную трубку і жывое срэбра і праверыўшы яго ў сямігодцы ці ў аграпома. Трэба набыць вясы для аналізу глебы, сьніпоўку і хоць у больш буйныя школы рэторты і рэактывы дзеля здабыцьця тлёну, вуглятлёну.

Калі вучань, начынаючы з васковай школы, будзе адчуваць ролю законаў прыроды ў жыцьці, дык з ім лепш працаваць і далей, хутчэй зрабіць і культурную рэвалюцыю.

Разьвіцьцё мэтэорологічных і фэнолёгічных назіраньняў на школах—таксама багатая крыніца дзеля барацьбы з рознымі забабонамі, бо тут навочна і яскрава відаць залежнасьць нашага жыцьця ад прыроды, якую мы павінны прымусіць служыць на нашу карысьць.

Архіпаў.

На фронце культурнага будаўніцтва.

Апошні год у галіне народнае асьветы праходзіў пад знакам значнага ўзмацненьня зацікаўленасьці працоўнага насельніцтва школай.

Гэта выявілася ня толькі ў справе пасылкі дзяцей у школу, але, у значнай меры, і ў галіне адукацыі дарослых у вячэрніх школах і школах па ліквідацыі непісьменнасьці.

Дзеля задаволеньня культурных запатрабаваньняў насельніцтва праведзена значная праца на пашырэньню сеткі школьных і палітасьветных устаноў і ў напрамку паляпшэньня якасьці працы ў існуючых.

З 1924-25 году на Мазырчыньне пачаў зжыцьцяўляцца план усеагульнага навучаньня.

У 1926-27 годзе агульны лік камплектаў чатырохгадовых школ і першага канцэнтру сямігодак быў 535, у 1927-28 годзе—607, —павялічэньне на 72 камплекты, або на 13,5 проц. Адназамплектавых школ адчынена 26, што складае 36 проц. ад агульнага ліку адчыняемых камплектаў.

З пашырэньнем школьнае сеткі павялічыўся % ахопу дзяцей школаю. У 1927-1928 годзе вучылася ў чатырохгадовых школах 25533 дзяцей, што складае 60,7 проц. ад агульнага ліку дзяцей школьнага ўзросту (ад 8-11 гадоў). У 1926-27 годзе гэты % быў 55. У 1926-27 годзе чатырохгадовыя школы скончыла 1149 чал. (6,2 пр. вучняў) а ў 27-28 г. — 2357 ч.—9 проц. агульнага ліку вучнёўства.

На школьнае будаўніцтва ў 27-28 годзе было адпушчана 122.000 р. Распачата будоўлю 3 двухкамплектныя школы і адна 4-хкамплектная, апошняя ўжо закончана. Многа сродкаў патрачана за дабудову раней пачатых школ. Аправа гэтага, па самаабкладаньню насельніцтва на школьнае будаўніцтва сабрана 90.000 р.

Лік сямігодак узрос з 19 у 1926-27 г. да 21 у 1927-28 г.

З прычыны ўзросшага напливу ў сямігодкі дзяцей рабочых і сялян, пры 8-мі райённых сямігодках адчынены пятыя раўналеглыя групы.

Каб даць магчымасьць вучыцца ў сямігодках дзецям бяднейшых сялян з вёсак, далёка адстаючых ад райённых цэнтраў, пры райённых сямігодках абсталяваны інтэрнаты.

У 26-27 г. з сямігадовых школ выпушчана 272 ч. (14,6 проц. агул. ліку вуч.), а ў 27-28 г.—387 ч. (16 проц. вуч.).

На 1928-29 вучобны год на пляну ўсеагульнага навучаньня неабходна было адчыніць 69 камплектаў 4-хгадовых школ. Фактычна-ж адчынена 34 камплекты, што складае ўсяго 49 проц. пляну. Сямігодак-жа адчынена тры новыя: 2 фабрычна-заводзкія —адна ў Мазыры пры фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» і другая ў Капцевічах пры фабрыцы «Зьвязда» (абедзьве беларускія) і і адна яўрэйская ў Юравічах. Дамавакінская сямігодка рэарганізавана ў школу сялянскай моладзі, якіх цяпер у акрузе будзе двое. Раней была адна, у Сянюках; яна мае 108 дзесяцін зямлі і сенажаці. Вучылася ў ёй 92 ч., скончыла—14.

Значна пашырылася сетка дашкольных устаноў. У летні перыяд існавала ў акрузе 39 пляцовак. Дзіцячы гарадок (250 дзяцей) рэарганізуецца ў піанэр-кампу. Вельмі добра працуюць педтэхнікум і прафтэхнічная школа рэмэсьнікоў-чэрнікаў.

У 27-28 годзе ў Жыткавішчыне райёне адчынена прафшкола рыбаводзтва.

Разьвіваецца піанэррух у школах. Расьце сетка палітасьветных устаноў. За апошні год адчынена 5 хат-чытальняў і 2 школы рабочай моладзі.

Мазырчыка. М. Гохфельд.

Скарыстайце магчымасьці.

(Кармянкі р-н, Магілёўшчына).

У 5 кілёмэтрах ад м. Карма знаходзіцца в. Навасёлкі, на кацы якой стаіць вялікі каменны будынак. У ім зьмяшчаецца школа 4-хгодка.

Аправа школы там зьмяшчаецца клюб яч КСМ, чытальня і яшчэ ёсьць шмат вольных пакоеў. Па сваім разьмерам гэты будынак мог-бы зьмясьціць не чатырохгодку, а школу навыменага тыпу.

Лепш за ўсё было-б адчыніць тут школу сялянскай моладзі, бо пры школе ёсьць каля 12 гектараў зямлі, 3 гэк. сенажаці і сад на плошчы 2-х гэктараў. Усё гэта было дадзена школе з былой панскай зямлі пры землеўпарадкаваньні в. Навасёлак у 1923 г.

Калісьці мяркавалася адчыніць тут ПСМ, але в часам справа гэта заснула. Урэшце Навасельскі КСУ рашыў скарыстаць маруднасьць з адчыненьнем ПСМ і адабраў ад школы 10 гэк. зямлі, сад, 2 гэк. сенажаці, а рэшта і цяпер знаходзіцца ў карыстаньні школы. Усё гэта зроблена адміністрацыйным парадкам са згоды Кармянскага РВК.

Было-б вельмі карысна, каб гэту зямлю вярнулі назад школе і з наступнага навучальнага году адчынілі тут замест 4-хгодкі ПСМ.

Асьветнік селькор.

Дальтон-плян ці лекцыйны мэтад?

З леташняга году ў Круглянскай сямігодцы (Аршанскай акр.) пачаў ужывацца ў выкладаньні лекцый Дальтон-плян. З пачатку вельмі цяжка было, бо за некалькі год вучні прывыклі да лекцыйнага выкладаньня. Асабліва цяжка было ў выкладаньні фізыкі і матэматыкі. Але, дзякуючы практычнасьці выкладчыка, а таксама дастаткова кольнасьці падручнікаў, гэту цяжкасьць пераадолелі, і да канца навучальнага году лекцыйны мэтад выкладаньня аправдаў. Гэты мэтад даў вучням больш вольнага часу на іншую карысную працу і аблягчыў працу настаўніка.

Лябараторны мэтад выкладаньня з растлумачэньнем настаўніка, такім чынам, летась працу вучняў зносна палегчыў.

Але ў гэтым годзе новы настаўнік на матэматыцы і фізыцы мэтад выкладаньня зьмяніў. Ён трымаецца лекцыйнага мэтаду, у якога вучні мала чаго разумеюць, бо прывыклі самастойна распрацоўваць, калектыўна, а зараз прыходзіцца распрацоўваць дома, індывідуальна.

Я лічу немэтазгодным гэткае выкладаньне, бо ў вучня не хапае часу, каб рыхтаваць лекцыі дома. Аправа гэтага, мы палечым вучняў, скачучы з мэтаду на мэтад.

Мясцовы.

м. Круглае.

Інспэктар з асабовым поглядам.

Калі каго з асьветнікаў там ці іншым умовы прымусяць зьвярнуцца да інспэктара асьветы Чэрэйскага райёну (Аршанчына) Пашкевіча аб пераводзе ў гэты райён на працу, дык ён пачуўшы атрымае адказ, досыць кароткі і зразумелы адказ: «Белае, у мяне заўсёды алкоўны погляд і дрэнная думка аб гэтых настаўніках, якія перавозяцца. І я павінен ушаўнева адказаць, што пераводу ў наш райён не атрымаеце".

Інспэктара Пашкевіча ўсім ня цікавіць стаж асьветніка, яго адукацыя, грамадзка-палітычная праца і нават абставіны, якія змушаюць да пераводу. Ці ня дзякуючы гэткім поглядам і думкам у райёне інспэктара Пашкевіча пастаянна вольныя школы, якія камплектуюцца не перад пачаткам навучальнага году, як усюды, а на працягу яго?

У гэтым годзе інспэктару ўдалося заняўніць дзьве школы настаўніцтвам толькі ў другой палове кастрычніка, а зараз яшчэ ёсьць месцы, дзе настаўніка няма і школа не працуе.

Асьветнік.

Распрацоўка 5-гадовага перспэктыўнага пляну.

Зараз у Дзяржпляне БССР супольна з прадстаўнікамі Наркамасьветы заканчваюць працу па распрацоўцы другога варыянту 5-гадовага разьвіцьця народнай асьветы ў Беларусі. Па гэтаму пляну прадугледжваецца павялічэньне зарплаты ўсім працаўнікам культасьветных устаноў к канцу 5-гадоўкі на 60 проц. Прадбачыцца павялічэньне выдаткі на стыпэндыі больш як на 1 500 000 руб. Зварачаецца ўвага ўкляпе і на якасное палепшэньне школ, на што ў плане павялічаны выдаткі больш як на 10 мілёнаў рублёў.

Наша перапіска.

Прамэнтару і Тэлескопу. Гурыновічу.

Вашы допісы па справе нас. Шыдлоўскага перасланы ў Менскую акр. пракуратуру.

АХРЭМУ. Хаславічы. Допіс «Прытхія людзі» зьмясьцілі ў сваю васьмігадзоту. Рэшта пойдзе ў нас.

ВУЧНЮ. Астравы. Пытаньне аб арганізацыі камісіі дапамогі вучням-бедакам стаўце ў сябе на месцы. Друкавань ня будзем.

Аўтарам заметкі «Знаёмства А. Кацеляга». Вашу заметку перасланы ў Інспэктуру Гакоўсацкіх на расьсьледаньне. Аб вынках паведамім.

Узьнімем прадукцыйнасьць нашых сенажацяй.

Увага сенажацям.

У той час, калі ўся савецкая грамадзкасьць зараз жвава абмяркоўвае розныя мерапрыёмствы па падвышэньню ўраджайнасьці, мы ня можам абысьці моўчкі такога паважанга пытаньня ў галіне сельскай гаспадаркі, як належнае ўтрыманьне нашых сенажацяў і поплаваў. Усім вядома, што, ня гледзячы на наяўнасьць досыць значнага пляцу сухадольных, заліўных і балотных сенажацяў, беларускі селянін амаль штогод многа траціць ад недахопу сена. Бываюць рэдкія гады, калі селяніну ня прыходзіцца выцягваць з напляцін саламянай страхі абамшэлую салому, каб парэзаць яе на сечку галоднай скаціне.

Тымчасам пры правільнай пастаноўцы дагляду за лугамі існуючы пляц іх можа ўдвойчы павялічыць ураджай сена. Нашы сялянскія сенажаці і паплавы вельмі часта пакрыты хмызьняком, кустаўём і куп'ём. Бываюць нават такія сенажаці, якія цяжка адносьці да сенажатных ужыткоўнасьцяў, бо хмызьняк займае на іх больш месца, чым пляц пад травой.

Трэба зараз-жа абвесьціць барацьбу гэтай неахайнасьці і нядбайнасьці. Сваімі сродкамі, бяз жадных машын, можна выцерабіць кустаўё, зрэзаць куп'ё. Трэба распачаць шырокую кампанію за паляпшэньне нашых сенажацяў, трэба ўцягнуць у гэту справу шырокія колы сялянства.

Сёлетняя маласьнежная восень якраз спрыяе гэтай працы; зараз можна шырока разгарнуць выцяроблівальне хмызьнякоў. У сучасны перыяд сялянства мае час і на гэту справу можа адвесьці досыць увагі.

Мы заклікаем спэцыялістаў і іншых зацікаўленых асоб выказацца на старонках нашай газэты наконт закранутага пытаньня. Рэдакцыя лічыць, што на справу паляпшэньня сенажацяў, на ачыстку іх ад кустаўя і ад куп'я трэба зьвярнуць увагу ўсіх нашых земельных і савецкіх органаў і сялянства.

Нашы сенажаці запушчаны.

Сенажаці Беларусі, галоўным чынам, сялянскія страшэнна запушчаны. У сярэднім сялянскія сенажаці даюць з дзесяціны каля 60 пудоў сена. Тым часам пры мінімальным догляде за імі ўраджай сена можа павысіцца да 100 пуд.

Паглядзім, у якім выглядзе знаходзяцца нашы сялянскія сенажаці?

Раньняй вясной і позна ўвосень пасьвяць жывёлу. Ад гэтага сенажаці і паплавок загружаюцца на іх зьяўляюцца лагчынкі, у якіх зьбіраецца вада, спрыяючы працэсу забалочваньня; на такіх сенажацях пачынае расьці мох, што, бязумоўна, адбіваецца на якасьці ўраджаю. Апроч гэтага, без дагляду на сенажацях паступова пачынае зьяўляцца куп'ё, а гэта значна зьмяншае выгодны пляц сенажаці і пагаршае працае уборкі і кашэньня травы.

Зараз перад усёй нашай грамадзкасьцю павінна паўстаць неадкладная задача павысіць прадукцыйнасьць сенажацяў.

Мы ня можам больш дзярпець, каб замест травы на сенажацях расла нейкая нэндза, замест спажыўнай, мурожнай травы—нейкая малакаштоўная расьліна, як сівец, елка і інш. Не чакаючы спэцыяльных мерапрыёмстваў, само сялянства сваімі хатнімі спосабамі можа палепшыць якасьць нашых сенажацяў. Выцярэбліваньне хмызьнякоў ці зрэзаць куп'ё можна бяз жаднай навукі, бяз спэцыяльных машын і прыладаў.

Выцярэбліваньне хмызьнякоў трэба распачаць зараз-жа, тым больш што пакуль што яшчэ невялікі сьнег. Апроч гэтага, зараз выгодна праца ваць у балотцістых мясьцівах, бо зямля ўжо замерзла.

Цяпер якраз ёсьць шмат часу, і сялянства можа на гэту справу зьвярнуць больш увагі. Трэба, каб нашы сельсаветы і зямельныя органы прынялі самы актыўны ўдзел у выраваньні выцярэбліваньня хмызьнякоў на сенажацях. Рабіць гэта найлепей цэлымі вёскамі, талакой.

Наш селянін павінен зразумець, што калі ён зараз папрацуе 2-3 дні, то здабудзе гэтым увосень наступнага году некалькі дзесятакаў пудоў лішняга сена; выцярэбліваньнем хмызьнякоў на балотах можна палепшыць пашу для скаціны, зьнішчэньне гушчароў кустаўя зьнішчыць выгоду для расплоджваньня ваўкоў, якія часта шмат шкодзяць нашаму сялянскаму статку. Апроч таго, гэтым самым можна здабыць добры апал.

Дзеля павялічэньня ўраджаяў травы трэба распачаць баранаваньне сенажацяў, што павінна рабіцца раньняй вясной, калі зямля яшчэ ня зусім аттала. Дзякуючы баранаваньню, асьвяжаецца дзярніна, выдзіраецца мох. Апроч гэтага, наша сялянства павінна заняцца зьбіраньнем попелу, які зьяўляецца вельмі карысным угнаеньнем для сенажацяў. Там, дзе высыпаецца попел, пачынае расьці вельмі добрая трава. Але дзеля гэтага попел трэба зьбіраць у працягу ўсёй зімы і захоўваць яго у сухім месцы, каб у яго не папала вільгаць.

Да рэчы, трэба адзначыць, што наша сялянства амаль нічога ня робіць у справе палепшаньня такіх сенажацяў, на якіх расьце сівец, гэтая вельмі мала карысная трава. Звычайна гэта трава расьце на падзолістых глебах, якая патрабуе вапнаваньня і наогул угнаеньня. Тым часам пры сучасным становішчы сенажаці з сіўцом не даюць жаднае карысьці.

Трэба таксама спыніцца на палепшаньні нашых выганаў, якія знаходзяцца вельмі часта ў занядбане. На некаторых выганах капаюць ямы, на іх расьце хмызьняк. Мала таго, выган часта псуюць сьвіньні, якія скоўваюць дзірван. Адначасова з гэтым трэба зьвярнуць увагу на палепшаньне стану выганаў з тарфянай глебай, на якіх звычайна расьце вельмі нэндзная трава.

Адным словам, мы павінны зараз узварушыць грамадзкую думку вакол палепшаньня сенажацяў. Бяз жадных затрат можна значна палепшыць ураджай травы.

Нашы сельсаветы і зямельныя працаўнікі на вёсцы павінны стаць застрэльшчыкамі ў гэтай важнай і адказнай справе.

Культуртэхнік Наркамаэму Волкаў.

ДРЭННЫЯ СЕНАЖАЦІ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ РОСКВІТ ГАСПАДАРКІ.

Жывёлаводзтва і пры тым малочнае павінна адыгрываць у БССР галоўную базу, на якой будзе грунтавацца ўся аснова сельскай гаспадаркі. Але тут мы ўпіраемся ў тупік—у недахват натуральных кармоў, галоўным чынам, сена. Недахват сена бывае не таму, што ў нас бракуе сенажацяў, а таму, што нашы сялянскія сенажаці вельмі запушчаны. Звычайны сялянскі поплаў, пакрыты хмызьняком, карчамі, куп'ём, можа даць з гэктару 40-60 п. сена. Дзеля таго, каб сабраць 250-300 пудоў сена неабходна сярэдняй сялянскай гаспадарцы, 5-6 гэктараў сучасных сенажацяў, а такая норма вельмі рэдка ў якога селяніна здараецца. Зусім слушна, што пры такім становішчы нечага думаць ні аб малочнай гаспадарцы, ні аб павялічэньні балянсу гною, які адыгрывае вялікую ролю ў павялічэньні ўраджайнасьці.

Тым часам, існуючы пляц сенажацяў пры нязначнай затраце часу можа даць вялікі эканамічны эфэкт. Калі-б выцерабіць хмызьняк, выкарчаваць карчы і зрэзаць куп'е—гэктар сенажаці можа ўтройчы павялічыць свой ураджай. Такія вялікія ўраджаі мы зараз атрымоўваем у мэліяраційных т-вах, дзе з гэктару бывае да 400-500 пуд. сена.

Трэба лічыць нейкім недарэчным анахранізмам, што маем шмат сенажацяў, а вясной даводзіцца часта рэзаць скаціне на корм гнілую салому. У Менскай акрузе забалочаныя сенажаці складаюць да 65 проц. у адносінах да пахаты. Калі-б гэтыя сенажаці прывесьці ў парадак, г. з. павялічыць адпаведна іх ураджайнасьць, можна ў 5 разоў павялічыць статак.

Мы павінны зараз-жа ўжыць рашучыя меры да паляпшэньня становішча нашых сенажацяў; трэба аддаць максымум увагі гэтай справе. Але, ня гледзячы на тое, што спосабы паляпшэньня сенажацяў вельмі простыя, зусім нескладаныя, справа ня зрушыцца з месца, пакуль ня будзе выдана спэцыяльная пастанова ўраду, прытым пастанова павінна ахопліваць ўсе мерапрыёмствы да паляпшэньня сенажацяў.

Гаспадарчы эфэкт ад паляпшэньня сенажацяў будзе атрыманы ў бліжэйшыя 2-3 гады. Вось чаму на гэту справу трэба зьвярнуць зараз належную ўвагу.

Акруговы культ-тэхнік Пятроўскі.

БОЛЬШ УВАГІ С.-Г. ПАДАТКУ.

ДА 1 СЬНЕЖНЯ ПАСТУПІЛА ПА БССР 7875619 РУБ.—ЯК І РАНЕЙ АДСТАЮЦЬ ПОЛАЧЧЫНА, ВІЦЕБШЧЫНА І ГОМЕЛЬШЧЫНА.—НЯ ДБАЙНАСЬЦЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ ДА СЫСКАНЬНЯ ПАДАТКУ.

(Гутарка з начальнікам падатковага кіраўніцтва НКФ БССР тав. Кардашэнкам).

Водлуг вестак Наркамфіну, на 1-га сьнежня па БССР паступіла сельска-гаспадарча падатку 7875619 р.

Трэба адзначыць, што, як і раней, адстаюць Полацкая, Віцебская і асабліва Гомельская акругі.

Нас цікавіла пытаньне, чым тлумачыцца слабое паступленьне падатку ў гэтых акругах?

Вось чаму туды і былі зроблены паездкі адказных працаўнікоў Наркамфіну. Зразумела, сабраныя весткі не даюць магчымасьці сказаць, што па ўсіх акругах аднолькавае становішча. Матар'ялы з Полаччыны па нашай думцы, зьяўляюцца, вельмі каштоўнымі і таму на іх трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу ўсіх акруг.

Трэба сказаць, што паступленьне плацяжоў па с.-гаспадарчаму падатку, страхоўцы і інш. у Полацкай акрузе дагэтуль ішло самацёкам.

Досыць сказаць, што па вестках на 1 сьнежня з 9 райёнаў толькі ў двух сыскан прымусова падатак са злосных неплацельшчыкаў.

На іншых-жа райёнах Полаччыны ў гэтым напрамку нічога не рабілася.

Азнаёміўшыся са становішчам на месцах, мы высьветлілі наступнае:

Па Салоніцкаму сельсавету, Полацкага райёну, у вёсцы Тросьніцы неплацельшчыкаў па першай раце ёсьць 13 і на другой—25. Калі мы паглядзелі, хто-ж зьяўляецца неплацельшчыкам падатку ў прыгарадным пункце, дык убачылі, што, прыкладна, з 20 плацельшчыкаў усяго населішча 10 гаспадарак заплацілі да 1 сьнежня замест 810 руб. толькі 260 руб. падатку.

На маё запытаньне старшыні сельсавету—што ім зроблена, каб напомніць аб аплаце падатку, я атрымаў адказ:

— «Я быў вельмі заняты»...

Мы думаем, што такі адказ з боку старшыні сельсавету патрабуе высьвятленьня.

У Барковіцкім сельсавеце, Валынецкага райёну, справа з падаткам стаіць таксама ня лепш. З агульнага ліку 734 гаспадарак па сельсавету поўнасьцю і часткова вызвалена ад падатку 446 гаспадарак, а 288 павінны яго поўнасьцю плаціць. Між тым да дню нашага прыезду з 288 гаспадарак заплаціла падатак толькі 66, а рэшта зусім не плацілі па другой раце. Усё гэта дае падставу меркаваць, што вышэйстаячыя савецкія органы акругі не зва ачвалі належнай увагі на сысканьне плацяжоў у вёсцы. Нізавыя-ж органы ўлады ў гэтых выпадках нічога не зрабілі для таго, каб сыскаць з насельніцтва дзяржаўныя плацяжы.

Адзін з вельмі адказных працаўнікоў фінадзелу выказаўся, што ў іх дагэтуль быў „скідачны настрой",—г. зн. была зьвернута ўся ўвага на прадастаўленьне скідак. Але ў гэты час імі не зварачалася ніякай увагі на сысканьне сум, якія засталіся пасьля скідкі, а таксама ня прымалася ніякіх мер да сысканьня з тых, якім скідка не давалася. Відавочна, гэтым «скідачным настроен» хварэў нізавы савецкі апарат.

У тым-жа Барковіцкім сельсавеце высьветліліся злачынныя адносіны з боку ранейшага сельсавету да справы самаабкладаньня мінулага году.

Досыць сказаць, што нам не ўдалося ўстачавіць суму, якая прынята на самаабкладаньню, а таксама і сысканьні па апошняму. З 69 насельных пунктаў гэтага сельсавету толькі па 30 ёсьць раскладачныя ведамасьці па самаабкладаньню. Па нашаму патрабаваньню з райвыканкому на месца выехала спэцыяльная камісія, і трэба думаць, што пасьля праверкі тут справа бяз суду не абыйдзецца. І гэта зразумела, бо ў працягу некалькіх гадзін, калі мы там былі, адзін селянін заявіў аб тым, што грошы, якія ён перадаў был. сэкратару сельсавету для аплаты падатку, у касу ня ўнесены. Такія-ж заявы паступілі яшчэ ад двух сялян.

Усе гэта, магчыма, здараецца і па другіх акругах, а таму мы і лічым неабходным зьвярнуць увагу на гэтыя недахопы і недарэчнасьці ўсіх акруг БССР.

Перад савецкім апаратам стаяць вялікія задачы: у працягу якіх-небудзь 2-х месяцаў сабраць сельска-гаспадарчы падатак, страхоўку і г. д. Ні ў якім разе нельга думаць, што без напамінаньняў і энэргічнай працы нізавога савецкага апарату мы зможам выканаць гэтыя задачы.

Мы заклікаем прымаць масавыя рэпрэсыўныя меры, але калі заможная гаспадарка ўпарта спрабуе сарваць нашы пляны і злосна ўпіраецца ад аплаты падатку ў вызначаныя тэрміны, дык ім трэба напомніць аб савецка-рэвалюцыйнай законнасьці.

ПА-ЗАРЭЧКАЙ, НА ДРУГІМ БЕРАЗЕ...

(З дарожных нататак).

Ехалі полем, ехалі лесам, ехалі праталінкам і ўсюды вазьніца Андрэй злазіўся.

— Ах дарога... дарога!.. Чэрці па ёй евьдзілі, дальбог...

Калёсы прыгалі на нарэньнях, на жупіцы ўрэзваліся ў размокшую ад вясеньніх дажджоў зямлю, а калёса—бедныя, заморана—капытамі скарадзіў дарогу, спатыкаючыся на кожнай купіне, на кожным палене.

— Н-н-н-о-о-о, лявіны! Н-н-о-о-о! Хутка Падбярэзьзе—адпачнем.

Кроваў пятнаццаць прабег канька рысцой, а потым зноў заспарадзіў дарогу.

— „Сынулі ту", — жартаваў Андрэй.

— Дасядзем як-нешудзь.

Наабапал дарогі раскінуліся неабжынны беларускія прасторы навёў. Паламанае жывёлай іржышча, голы бярозавы гай, сівер недзяніты і жосткі —усё казала аб надыходзячай зіме.

З-за ўзгорку паказаліся першыя хаты.

—Уяжджаем у вёску,—растлумачыў Андрэй.

Залітая морам гразі вуліца, саламяныя стрэхі, прысады пад вокнамі, клёны, бярозкі, дзе-ні-дзе яблыня—звычайная беларуская вёска.

А ў нізе, паміж ніцай лазы і сумшай, бязьлістнай вольхі—прапякае рэчка Крывая. Летам явар перашпортваецца з асакою, хлапчукі не вылазяць з ас—то купаюцца, то рыбу вудзяць.

* * *

Пасярод вёскі—школа. Прасторныя новы будынак. Калі-ве-калі сходы сялянскія праходзяць у ім.

Хапа вёска Падбярэзьзе і Коханаўскага райёну, але ёй адпаўкава адлегласьць і да м. Талочына—усёроўна сем вёрст. Талочын больш гавдлёвы цэнтр, а пагэтаму падбярэзцы адаюць увагу больш талочынскаму кірмашу.

Глеба ў пераважнасьці суглініста—супясковая, нападаецца дзе-ні-дзе і падзол. Вільгаці колькі хочаш—засуха ня страшна.

Гэта растлумачвае мне Андрэй. Тым часам мы праехалі палову вёскі. Астанавіліся. Куды зайсьці?

— Цётка, куды параіш заехаць?—запытаўся Андрэй у праходзячай жанчыны.

Жанчына, якую назваў Андрэй «цётка», запыталася хто нам трэба, чаго прыехалі, адкуль?

— З «цэнтру», цётка,—растлумачыў Андрэй.

— Дык тады, ведаеце, да аграпома нашага.

— Як у вас у вёсцы аграбом жыве?

— Не, гэта наш селянін, толькі мы яго завём аграномам:

— Чаму так?

— А таму, што ён дружа з аграномамі, гаспадарку вядзе пад іх кіраўніцтвам.

— Ага, дык вось як,—засьмяяўся Андрэй.—Тады паедзем да «аграпома».

«Цётка», маладая, вясковая жанчына, сказала дзе жыве «аграном» і мы накіраваліся да яго.

Мяне зацікавіў гэты «аграном» у вясковай глушы і я з прагнасьцю чакаў хвіліны, калі ўбачу яго, пагутару з ім.

* * *

Прасторная, чыстая хата. На сьценах плякаты з «Крестьянской газеты». У куту, так, паміж іншым, „на старай прывычцы"—іконы. Мы сядзім за сталом. Супроць мяне—селянін сярэдніх год,—«аграном» Матыль Мацей.

Гутарым аб пагодзе, цэнах на збожжа, ураджаі. Так, быццам ненарокам, пераходзім на тэму аб гаспадарцы Матыля.

— Мяне жартам завуць адпаўскоўцы «аграномам»... Ну які з мяне аграном? Ну што ў мяне такое ёсьць?

— Я прашу яго разказаць мне ўсю гісторыю гаспадаркі.

— Ну, што-ж расказу,—з ахвотай пачынае «аграном».

— У 1923 годзе нашых трыццаць тры двары падбярэзцаў перайшлі на 8-мінольны севазварот.—Бывай трохпольле з галадухай, бывай назаўсёды,—сказалі мы тады.

Пачалі засяваць два палі жытам, два палі канюшынай, пад бульбу адно поле і г. д. Адным словам пачалі жыць па пляну.

Пад папарам пустуе адна восьмая частка зямлі. Зараз мы дашлі да таго, што ўвесь папар угноўваецца. Пад авес і бульбу робіцца рачьвяя заблевая ўспашка. Вясною, як закон, поле барануецца баравою „зі-заг".

— А зерне вы ачышчаеце?—За мяне запытаўся Андрэй.

— Бязумоўна. Аб гэтым можаце спытаць на коханаўскім аграпункце,—там ведаюць нашу вёску як сумую акуратную ў сэнсе зернаачышчэньня.

Далей мы даведваемся аб досыць арыгінальным мэтадзе засеву бульбы, які можна рэкамэндаваць усім гаспадарам Беларусі.

Баразна, па якой сеецца бульба, праводзіцца ня глыбока, а якой прыкрываецца—значна глыбей. Адлегласьць аднае бульбіны ад другой ня менш трох чвэртак аршыну.

Пасьля таго, як бульба засеяна, поле барануецца, а калі бульба ўзыйдзе вяршкі на чатыры ад зямлі—робіцца абмешваньне. У сухую пагоду піводзін гаспадар вёскі ня пойдзе рабіць абмешваньне бульбы, бо ад гэтага яна можа завяць, а то і зусім зьнішчыцца.

— Ведаеце што,—пачынае Матыль, —сёлета я браў напрактацыю па паўгэктара бульбы. Досыць карысная штука. Я раю ўсім суседзям рабіць так.

— Спачатку, асабліва 23-24 г. г., было вельмі цяжка.

Вазьму хаця сябе: у мяне чатыры душы сямейства, з якіх толькі два працаздольных. Усю зямлю на сваіх плячох прыходзіцца несьці. Зараз у мяне чатыры дзесяціны ворнай зямлі і адна дзесяціна сенажаці. Трымаю на гэтай гаспадарцы 2 каровы, 1 цялё, 1 кабылу і пяць сьвіней. Мая кабыла племянная, нават на выстаўцы атрымаў прэмію за яе—плуг і спружынавую барану.

— Часта я раблю параўнаньне сваёй цяперашняй гаспадаркі з гаспадаркай да пераходу на шматпольле: мо' не паверыце—хлеба не хапала тады... а зараз я не клапачуся аб гэтым—нават мяркую кожны год збыць некалькі пудоў.

— А я чуў, што пры шматпольлі ніколі ня будзе хапаць хлеба. Дык хіба гэта ня праўда? — Запытаўся Андрэй.

— Вядома няпраўда. Усе думаюць, што пры шматпольлі будзе засяваца жытам чацьвертая альбо пятая частка поля, а пагэтаму будзе недахоп хлеба. Яно-та праўда, але паменшваньне плошчы пад жытам яшчэ ня знача, што паменшыцца колькасьць хлеба. Наадварот:—пачнем засяваць канюшыну—павялічым колькасьць жывёлы, угноім лепш зямлю, ды і сама канюшына значна па ўраджае якасьць глебы, а раз так, то і ўраджай жыта будзе большы за ранейшы.

— А які ў вас быў раней ураджай і які зараз?

— Бывала, калі яшчэ скакалі мы на трохпольлі, звычайны не ўраджай, а сьмех—50-60 пудоў з дзесяціны, а зараз, ня хлушу,—можаце даведацца ў аграпома,—канюшыны з дзесяціны 300-350 пудоў, бульбы 900-1000 пуд., жыта 80-110 пудоў, а аўсу 60-80 п. Апроч гэтага, мы зьвярнулі сур'ёзную ўвагу на тэхнічныя культуры—бульбу, лён, канюшыну. З кожным годам ураджай гэтых культур павялічваецца.

— Вёска наша культурная,—з гапарлівасьцю кажа Матыль. За прыкладнае вядзеньне гаспадаркі атрымалі шмат прэмій на выстаўках: малатарню з прыводам, барану спружынную, дзьве арфы і сэпаратар. Усімі гэтымі машынамі карыстаемся калектыўна. Арганізавалі ў вёсцы злучны пункт, у які агранамія дала, у выглядзе прэміі, добрага заводзкага кныра пароды йёркшыр. Злучны пункт абслугоўвае ня толькі нашу вёску, але і шмат суседніх. Добра працуе ў нас і пажарная дружына. Атрымалі таксама і тут прэмію—пажарную машыну. Газэта неабходны прыд

ПАДЗЯКА НЕЗАМОЖНІКАЎ-УКРАІНЦАЎ МЕНСКІМ РАБОЧЫМ і ЦСПСБ.

Мы незаможніі ад імя нашых незаможнікаў выносім шчырую падзяку менскім рабочым і ЦСПСБ за прыхільныя адносіны да нас—незаможнікаў-украінцаў.

Мы выказваем жаданьне і ў будучым мець братэрскую цесную сувязь з беларускімі рабочымі і незаможнікамі-селянамі.

Прыміце наша шчырае прывітаньне і падзяку.

БАЙЧУК, ТУР, МАРЦІЕНКА, АГАРОДНІ, ТЭСЬЛЯ, НАДАРОЖНЫ, АНІКА, РУСОЎ.

Недарэчнасьці ў загатоўчай працы.

Некалькі дзён таму назад Наркамгандлем БССР быў разасланы абежнік усім асноўным загатоўцам БССР каапэрацыі і дзяржзагатоўцам, а таксама акруговым інспэктарам гандлю.

У гэтым абежніку вельмі рашуча і настойліва адзначаецца, што канкурэнцыя паміж загатоўцамі яшчэ ня спыняецца, ажыятаж на рынку ня зьнішчан, барацьба за рынак—у поўным росквіце. Гэты абежнік не дарэмна разасланы, бо, прыглядаючыся бліжэй да нашых загатоўцаў, лёгка пераканацца, што ўсе гэтыя нездаровыя зьявішчы, якія назіраліся ў мінулым годзе, зараз таксама яшчэ жывуць і ў некаторых мясцох дасягаюць значных размераў.

У мэтах урэгуляваньня пушнога рынку, як унутры краіны, так і за межамі, Эканамічная Нарада ўхваліла пастанову, што сёлета экспартам пушніны займаецца выключна Белдзяржгандаль, а ўсе іншыя навінны здаць пушніну апошняму. Але Белкаапсаюз да гэтага часу не жадае заключаць дагавораў з Белдзяржгандлем; Белсельсаюз заключыў дагавор, але пры гэтым прыслаў афіцыйную паперу з наступнаю дапіскаю: «Мы заключаем з вамі дагавор толькі таму, што гэта пастанова Эканомнарады, у іншым выпадку мы-б з вамі дагавору не заключалі».

На мясцох справа пастаўлена яшчэ горш. «Улада на мясцох» да гэтага часу ня хоча прызнаваць некаторыя дырэктывы вышэйшых рэгулюючых органаў, РВК і сельсаветы зачыняюць самавольна пункты, не даюць дазволу на адчыненьне новых пунктаў, нягледзячы на тое, што на гэта ёсьць дазвол Наркамгандлю.

Загатоўка лёну—валакна праходзіць вельмі слаба; з прычыны канкурэнцыі і „барацьбы за рынак", сяляне не ведаюць, каму трэба раней здаваць лён.

У Ворны агенты с.-г. каапэрацыі зьбілі рэспубліканскага бракера па валакну, за тое, што ён «адважыўся» сказаць, што яны парушаюць цэны.

У Бягомлі нядаўна міліцыянэр, па загаду РВК, прагнаў агента Белдзяржгандлю Зэльківда з рынку, арыштаваў яго на 2 гадзіны да скончэньня рынку і толькі калі была атрымана тэрміновая тэлеграма з Менску, што гэта незаконна, РВК неахвотна выпусьціў яго.

У Бабруйску старшыня таварыства «Красный Пахарь» самавольна дапытвае агентаў іншых арганізацый, не дае ім працаваць.

Словам, «барацьба за рынак» ідзе па ўсяму загатоўчаму фронту.

Што робіцца для зьнішчэньня гэтага зла?

— Пішам абежнікі, даём дырэктывы—адказваюць у Наркамгандлі.

Не, гэтага мала. Трэба павесьці па сельсаветах, РВК і пізавой каапэрацыі агітацыйную кампанію аб ролі і значэньні нашых загатовак і аб шкодзе канкурэнцыі, ад недапушчальнасьці гэтай «барацьбы» за рынак. Гэту працу навінны выканаць у першую чаргу Аграгандаль на мясцох, гэта іх непасрэдны і галоўнейшы абавязак.

Толькі тады, калі ўсе прасякнуцца думкаю, што канкурэнцыя—гэта самы люты вораг нашых інтэнсыўных і карысных загатовак, толькі тады можна будзе спакойна і прадукцыйна павесьці працу.

Апошні абежнік, аб якім мы зазначалі вышэй, павінен быў стварыць пэўны пералом у працы; між тым толькі гэтымі дзвюма хоцімскі каапэратыў дазволіў сабе перапяць тавары, якія былі прызначаны для іншай загатоўчай арганізацыі.

Гэткім недарэчным учынкам павінен быць паложан канец, з гэтымі ненармальнымі зьявішчамі трэба змагацца.

Ужо мінула 2 месяцы, а ў адносіне канкурэнцыі, ажыятажу, парушэньня цэн, барацьбы за рынак мы нічога не зрабілі.

Трэба павесьці кампанію за аздараўленьне рынку, трэба ў 1928-29 гаспадарчым годзе ўжыць самыя энэргічныя меры да таго, каб ня было ніякіх непаразуменьняў на глебе нашых загатовак.

Загатоўчая кампанія павінна прайсьці без непаразуменьняў, і ўсе загатоўцы, іменна ўсе, павінны падтрымаць гэту думку; тады справа пасунецца наперад з большым посьпехам.

Лоўскі.

Узмацніць збор мэталічнага лому.

Гэтымі днямі Менск наведаў намесьнік кіраўніка кіеўскай канторы Рудмэтальгандлю тав. Калбоўскі.

Мэта яго прыезду—прыняцьце шэраг мерапрыёмстваў да ўзмацненьня загатовак мэталічнага лому на БССР.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам тав. Калбоўскі паведаміў наступнае: згодна заданьня на БССР за першыя два месяцы (кастрычнік-лістапад) новага гаспадарчага году, павінна было быць загатоўлена лому—3459 тон.

Загатоўлена-ж за гэты тэрмін па БССР 2626 тон, што складае 75 проц. заданьня.

Асноўнай прычынай невыкананьня пляну трэба лічыць тое, што на мясцох каапэрацыйныя арганізацыі не звяртаюць належнае ўвагі на важнасьць гэтага віду загатовак, ня прымаюць патрэбных мерапрыёмстваў да посьпяховага яго збору.

7-га сьнежня пад старшынствам т. Стракоўскага адбылося пасяджэньне камісіі пры Эканомнарадзе.

На гэтым пасяджэньні было таксама канстатавана, што каапэрацыйныя арганізацыі (Белкаапсаюз, Белсельсаюз) не разгарнулі сваю працу на мясцох па збору мэталічнага лому. У сувязі з гэтым даручана Наркамгандлю ўжыць дадатковыя меры да гэтых арганізацый.

На пасяджэньні камісіі быў таксама абгаворан плян загатовак лому па БССР на вёсны.

На думцы камісіі, гэты плян можа быць лёгка выкананы. Так, усяго па БССР павінна быць загатоўлена лому 5800 тонн. А выходзячы з таго, што зараз па БССР налічваецца каля 2000 каапэрацыйных адзінак, дык кожнаму каапэратыву прыдасьцца загатовіць па 3 тоны, што ўпаўне магчыма.

На гэтым пасяджэньні быў выпрацаван шэраг мерапрыёмстваў да больш пасьпяховага правядзеньня загатовак мэталічнага лому па БССР.

Так, пастаноўлена выдзеліць спэцыяльны фонд мэталяў для прэміраваньня пізавых каапэрацыйных арганізацый, якія лепш правядуць працу па збору мэталічнага лому.

Камісія прызнала неабходным даручыць ВСНГ БССР даць распараджэньне ўсім прамысловым прадпрыёмствам, каб яны здалі ўвесь лом.

Апрача гэтага, камісія пастанавіла зьвярнуцца ад імя Эканомнарады БССР да ўсіх акрвыканкомаў аб выданьні спэцыяльнай пастановы аб канцэнтрацыі лому ў дамаўладаньнях для перадачы канторам Рудмэтальгандлю.

Выданьне гэткіх пастаноў дасьць магчымасьць палегчыць працу камсамольцаў пры правядзеньні імі вучоту лому.

Наогул, загатоўкам мэталічнага лому павінна быць зьвернута максымум увагі як з боку дзяржаўных, гаспадарчых і каапэрацыйных устаноў і прадпрыёмстваў, гэтак і грамадзкіх арганізацый.

Апошнія шляхам наладжваньня спэцыяльных нядзельнікаў і суботнікаў па збору мэталічнага лому навінны гэтым самым садзейнічаць пасьпешнаму выкананьню пляну.

ХРОНІКА.

Праезд замежных дэлегацый на ўсесаюзны зьезд прафсаюзаў.

У нядзелю 9-га сьнежня дэлегацыя ЦСПСБ у складзе т. т. Табайніка і Мацюкевіча выяжджала ў Негарэлае для сустрэчы заграніччных рабочых дэлегацый, якія праз Негарэлае—Менск накіроўваліся ў Маскву на VIII усесаюзны зьезд прафсаюзаў.

Пакуль што праехала толькі 4 чалавекі, з іх 2 з Аўстрыі—прадстаўнік «Камітэту Адзінства Прафруху». Адзін з членаў аўстрыйскай рабочай дэлегацыі тав. Гоннэр зьяўляецца сэкратаром першай аўстрыйскай рабочай дэлегацыі, якая наведала Савецкі Саюз у пачатку 1926 году і была ў Менску 3 дні.

Астатнія два таварышы з Нямеччыны, з іх адзін з Бэрліну, а другі горнарабочы з Рурскай вобласьці.

Да адходу цягніка ў Менск вялася ажыўленая гутарка. Заграніччныя дэлегаты вельмі цікавіліся пытаньнямі працы VIII усесаюзнага зьезду прафсаюзаў. У прыватнасьці тав. Гоннэр цікавіўся тым, як разьвіваецца гаспадарчае будаўніцтва ў БССР.

Дэлегаты ЦСПСБ праводзілі замежных братоў да ст. Менск, адкуль паехалі далей у Маскву.

Падрыхтоўка да дзесяцігодзьдзя БССР па лініі прамысловасьці.

Дзесяцігодзьдзе існаваньня БССР па лініі прамысловасьці ВСНГБ мяркуецца адзначыць дыменьнем шэрагу новых прадпрыёмстваў. Будуць пушчаны ў ход наступныя новыя прадпрыёмствы: самы вялікі ў БССР Талочынскі крахмальны завод, галантэрэйная фабрыка ў Менску, новы цэх на заводзе „Дрэваапрацоўнік" у Менску, і інш.

Адчыняецца новы рабочы пасёлак на торфаразпрацоўках каля Бабруйску.

Апроч таго, выдасьцца кніга „Промышленность БССР, итоги и перспективы", якая зьвяўляецца першай буйнай друкаванай працай у галіне прамысловасьці Беларусі. На некаторых вырабах прамысловасьці будзе отавіцца адзнака—„10 год БССР."

Пабудова ў Менску аўтаматычнай тэлефоннай станцыі.

На днях у Менск прыяжджаў член калегіі Наркампаштэлю СССР тав. Валенбург, якім быў заключаны дагавор з Менскім гарсаветам на пабудову аўтаматычнай тэлефоннай станцыі.

Згодна дагавору, Наркампаштэль павінен прыступіць да пабудовы станцыі не пазьней чэрвеня месяца 1929 г., з такім разьлікам, каб скончыць яе на працягу 3-х гадоў.

Арыентыровачная каштоўнасьць станцыі—1.800.000 руб.

Менскі гарсавет адпускае на гэту мэту 300.000 руб. і апрача гэтага дае бясспроцантную пазыку—150 000 руб. Астатнія сродкі адпускае Наркампаштэль СССР.

Аўтаматычную тэлефонную станцыю мяркуюць пабудаваць побач з клюбам Карла Маркса.

Урачыстае пасяджэньне, прысьвечанае памяці Н. Г. Чэрнышэўскага.

13 сьнежня ў Доме Культуры арганізуецца ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 100-годзьдзю з дня нараджэньня Н. Г. Чэрнышэўскага. На пасяджэньні з дакладамі выступяць рэктар БДУ праф. Пічэта, праф. Вольфсон і дацэнт БДУ тав. Гольман. Гэткія вечары, прысьвечаныя памяці Н. Г. Чэрнышэўскага, ужо адбыліся ў Пушкінскай бібліятэцы і ў клюбе Карла Маркса.

Запрашэньне БССР на выстаўку „Тэхніка—масам".

Беларускае т-ва культурнай сувязі з замежамі атрымала запрашэньне ад старшыні Ўсесаюзнага т-ва культурнай сувязі з замежамі О. Д. Каменеваў прыняць удзел на ўсесаюзнай выстаўцы «Тэхніка масам», якая адчыняецца ў пачатку 1929 г. Для ўдзелу ў гэтай выстаўцы запрошан шэраг навуковых і тэхнічных арганізацый з за межаў.

Электрыфікацыя заводаў.

Менскае аддзяленьне Дзяржаўнага Электратэхнічнага трэсту зараз вядзе працу па электрыфікацыі віцебскай акулярнай фабрыкі. Па апошняй устанаўліваецца 60 матораў магутнасьцю каля 300 конскіх сіл. Апрача гэтага, зараз электрыфікуецца Віцебскі дражджавы завод «Освобожденный труд»: там устанаўліваюцца 7 матораў, магутнасьцю ў 180 конскіх сіл. Электрыфікацыя гэтай фабрыкі і заводу будзе закончана да часу сьвяткаваньня 10-гадзьдзя агалашэньня БССР.

Менскі дзень.

5 вагонаў сэзоннай базаўлячаняровай тканіны і 5 вагонаў летняй тканіны дадатковa адпускае Саюзны Наркамгандаль у сьнежні месяцы Белкаапсаюзу.

— Пашыран склад мастацкай рады БДТ-1, згодна пастановы Галоўмасьпраства. У новы склад мастацкай рады ўваходзяць прадстаўнікі ад АПА ЦК КП(б)Б, акругкому ЛКСМБ, саюзу драматургаў, заканадаўчых, ад пэдагагічных, ад маталістаў, ад... ных газэт, ад аб'яднаньня пісьменьнікаў і т-ва дрампісьменьнікаў. Усяго 23 чал.

— 13 вагонаў паўбелага ваконнага шкла выдзелена для забясьпечаньня БССР на першы квартал бягучага 1928-29 гаспадарчага году.

— Інстытут студэнтаў-вылучэнцаў на навуковую працу арганізаваны пры БДУ. Кандыдаты-вылучэнцы будуць знаёмяцца прафэсарамі разам з студэнтамі арганізацыямі.

— Праўленьне Цукратрэсту адхаліла просьбу Наркамгандлю БССР аб отвараньні пастаяннага запасу цукру на тэрыторыі БССР у разьмеры 150 вагонаў пяску і рафінаду.

— У мэтах рацыяналізацыі Белкаапсаюз пастанавіў зьліць свае Харкаўскае і Кіеўскае прадстаўніцтвы ў адну Украінскую кантору БКС, якая будзе знаходзіцца ў Харкаве.

— Белрыбсэкцыя дала ўказаньне цэрабкопам узмацніць збор пяўкі. Да 1 студзеня Віцебскі ЦРК павінен сабраць 74.000 руб., Менскі—75.000 руб., Гомольскі—42.000 р., Бабруйскі—30.000 руб. і г. д.

Удзел БССР на выстаўцы ў Жэневе.

У нашых сьнежня ў Жэневе (Швэйцарыя) адчыняецца выстаўка дасягненьняў СССР за 10 год.

Беларускае т-ва культурнай сувязі з замежамі разам з ЦК беларускага т-ва Чырвонага Крыжу пасылае на гэту выстаўку шэраг матар'ялаў, якія характарызуюць нашы дасягненьні за 10 год.

Да пашырэньня вазнізацыі сярод прафсаюзаў.

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ быў заслуханы даклад Цэнтральнага Савету ТДА Авіяхіму аб працы і становішчы таварыства.

З дакладу відаць, што ТДА Авіяхім БССР ядае 2929 ячэек з 144949 сябрамі, з якіх рабочых 39829, сялян—32804, служачых—32516, вайскоўцаў—22306 і г. д. За апошні год лік розных гурткоў узрос з 836 на 1-XI—27 г. да 1441 на 1-VIII—28 году.

У шэрагах таварыстваў налічваецца выбранага актыву 20783 чал. і апрача таго звыш 1400 чал., якім даручаецца праца ў гурткох.

Спыніўшыся на асобных галінах працы таварыства, дакладчык зьвярнуў увагу на неабходнасьці да кіруючай працы ў таварыстве і прафарганізацыі. Усе нашы ячэйкі ТДА Авіяхіму навінны ўзгадняцца з прафэсыйнымі арганізацыямі—на прадпрыёмствах і ў клюбах. З боку прафарганізацый навінна аказвацца дапамога ва ўсёй працы таварыства і толькі пры гэтых умов х мы зможам паставіць на належную вышыню справу вазнізацыі насельніцтва.

Прэзыдыум ЦСПСБ даручыў спэцыяльнай камісіі апрацаваць практычныя прапановы на дакладу і ў прэзыдыум ТДА Авіяхіму вылучыў т. Кулака.

Халадзільная справа ў БССР разгортваецца.

Апрача пабудовы менскага халадзільніка, пачынаецца пабудова халадзільніка у Гомелі і Ворны, ідзе ўстаноўка халадзільных машын на цэнтральнай малочнай і г. д. Усё гэта патрабуе з боку беларускага халадзільнага камітэту больш увагі да гэтай працы. Для падняцьця працаздольнасьці камітэту, на апошнім яго пасяджэньні пастаноўлена арганізаваць бюро халадзільнага камітэту, на які ўскладаецца распрацоўка і вырашэньне найбольш важных пытаньняў. У склад бюро ўваходзяць прадстаўнікі ад Наркамгандлю, Наркамзьмяробства, менскага халадзільніка, Менакрвыканкому і г. д.

СУД.

ЗЬДЗЕКІ НАД ПАСТУХОМ.

У пасёлку Асаўкі, Пухавіцкага раёну жыве кулак Майсей Янкаў Клёўка. Апошнія тры гады Клёўка злаваў на пастушка Васіля Бакунчыка 17 год, з пасёлку Ленкі за тое, што ён ганяў кароў кали пасёлку Клёўкі і траву яго межы. Некалькі разоў Клёўка зьбіраўся пабіць Бакунчыка, але баяўся адказнасьці і ўрэшце расшукваў пастушы плян.

На карэвай фабрыцы імя Леніна, на адлегласьці вярсты ад пасёлку Клёўкі, служылі два міліцыянэры прамысловай міліцыі Аврам Арлоў і Язэп Ярош. Кулак Клёўка пазнаёміўся з міліцыянэрамі і заявіў, што пастушок Бакунчык бандыт, мае адрэзанку і страляе амаль кожны дзень.

Міліцыянэры Арлоў і Ярош раніцай затрымалі Бакунчыка, адабралі адрэзанку і прыцягнулі яго да адказнасьці.

1 верасьня г. г. Бакунчык па звычайнасьці рані ой пагнаў кароў у поле.

Міліцыянэры Арлоў і Ярош раптам выбеглі з лесу і крыкнулі Бакунчыку «Стой ні з месца! Рукі ўгару».

Бакунчык спалохаўся, кінуў трубу і нічога не разумеў.

— Ты бандыт?

— Не. Я пастух і вось маё стада.

— А адрэзанка дзе?

— Адрэзанкі я ня маю, я пасу кароў з трубой.

Арыштаваўшы Бакунчыка, міліцыянэры Арлоў і Ярош павялі яго да кулака Клёўкі, дзе зачынілі і трэбавалі адрэзанку.

Калі Бакунчык катэгарычна заявіў, што ніякай адрэзанкі ён ня мае і ніколі не страляў, Арлоў і Ярош павялі Бакунчыка на фабрыку, але па дарозе каля рэчкі Сьвіслачы, будучы застрашаны міліцыянэрамі аб суровым пакараньні, Бакунчык кінуўся ў рэчку каб утапіцца.

На крык Бакунчыка прыбеглі рабочыя фабрыкі. Міліцыянэры, выцягнуўшы Бакунчыка, у мокрай вопратцы, ня глядзячы на холад прывялі яго на фабрыку, зноў дапытвалі і толькі на пратэсту рабочых адпусьцілі Бакунчыка на волю.

Пакінутае стада кароў зрабіла шмат шкоды сялянству, а кулак Клёўка разьвёў чуткі, што Бакунчык сваў.

Да адказнасьці за зьдзекі над пастухом былі прыцягнуты міліцыянэры Арлоў і Ярош.

Справа разглядалася Менскім акруговым судом і прымаючы пад увагу, што ад злачынства міліцыянэраў цяжкіх вынікаў няма, што яны злачынства зрабілі будучы шчыра добра незнаёмымі з абавязкамі па службе, суд прыгаварыў Аврама Арлова і Язэпа Яроша на адзіному году ўмоўнага выяволеньня.

Д. Н.

НАВУКА і ТЭХНІКА.

Маскоўскі радыё-цэнтр.

Трэст заводаў слабага току спрэктаваў і пачаў загатаўляць на ленінградзкіх заводах магутныя перадатчыкі для буйнейшага ў СССР радыё-цэнтру, які ўжо будуецца ў Маскве. Новы радыё-цэнтр прызначаецца дзеля камэрцыйнай эксплёатацыі радыё-тэлефоннай сувязі са ўсім СССР і з буйнымі асяродкамі сьвету як на кароткіх, так і на доўгіх хвалях.

Усе станцыі радыё-цэнтру будуць зьвязаны з галоўным тэлеграфам, і гэта дасьць магчымасьць тэлеграфістам непасрэдна насылаць тэлеграмы. Новы радыё-цэнтр будзе гатоў для камэрцыйнай эксплёатацыі ў 1930 годзе. Агульны ры кошт перавышае 3 з паловай мільёны рублёў. Гэты радыё-цэнтр будзе адной з самых буйных радыё-станцый сьвету, прызначаных дзеля камэрцыйнай эксплёатацыі.

Аэрамаяк у 4000 футаў.

У Паўночнай Каліфорніі будуецца аграмадны маяк дзеля арыентыроўкі авіятараў у часе начных палётаў. Адзін маяк будзе пабудован на верхавіне гары Д'яблы, другі—на ўзгорку, на поўнач ад гораду Монтэбэлё.

Маяк на гары Д'яблы будзе аграмаднай пабудовай, вышынёй у 4000 футаў. Ён будзе мець магутны ліхтар у адзін мільён сьвеч, сьвет ад якога будзе відаць за 200 кілёмэтраў.

Астранамічны гадзіньнік.

Па адной з берлінскіх выставак быў паказан надта цікавы астранамічны гадзіньнік берлінскага майстра Шульцэ.

Гадзіньнік складаецца з 18 апаратаў, мае 468 колцаў. Дзесяць цыферблятаў паказваюць час—берлінскі і іншых гарадоў Сярэдняй Эўропы. Гэты-ж гадзіньнік паказвае час усходу і заходу сонца і месяца і іхнія зацьменьні. Па гэтым гадзіньніку складаецца шматгадовы календар руху нябёс.

„Чароўны дыван".

Міністэрства земляробства Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў апублікавала вынікі трохгадовага практыкаваньня „чароўнага дывана" ў чароўніцтве. Дываны гэты—звычайны толь, якім у нас крыюць стрэхі.

Вузкімі палоскамі толю накрываюць барозны паміж лехамі і бакі лех, пакідаючы толькі іхны верх. Ад гэтага глеба робіцца цяплейшай, лепш захоўваецца вільгаць у зямлі і зьнішчаюцца дзікія травы.

«Чароўны дыван» узьвышае ўраджайнасьць шпінату на 516 процантаў, салаты—на 200 проц., кукурузы—на 300 проц., а бульбы—на 400 проц.

Дом—за адзін дзень.

Усе часьці такога дома—сьцены, падлога і столь—робяцца з бэтону нашыкамі за месяць пабудовы, або прыдосланца гатовымі са спэцыяльных заводаў. З гатовых частак пры дапамозе падъёмных кранаў будынак устанаўліваецца за адзін дзень.

Дзеля канчатковага абстальваньня дому карыстаюць таксама гатовыя стандартныя часткі—дзьверы, вокны, прылады дзеля ацяпленьня і г. д.

Такі дом на адну сям'ю каштуе каля 5000 р.

Радыё замест правадоў.

Зараз распачынаецца вялікія работы на пераводу ўсёй камэрцыйнай эксплёатацыйнай сувязі пасобных чыгунак СССР з драцяных тэлеграфаў на радыё-тэлеграфы. Дзеля гэтага пры ўправах пасобных чыгунак будуць абсталяваны спэцыяльныя прыёмна-перадатачныя станцыі. Такія-ж станцыі будуць наладжаны і на буйных чыгуначных пунктах. Правады цяперашніх тэлеграфных ліній будуць скарыстаны на пабудаваньне тэлефоннай сувязі.

У першую чаргу вызначана радыёфікаваць чыгукі да Далёкім Усходзе ў Сібіры, бо там звычайная тэлеграфная сувязь часта мецуецца ад сьнегавых завеяў і навальніц.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю «Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. «Маладняк за пяць гадоў» 1923-1928. Максім Гарэцкі. Стар. 122, цана 65 кап.

2. «На рубяжы», Тарас Гушча. (Якуб Колас). Выданьне другое. Стар. 82, цана 45 кап.

3. «Навеварат» Ц. Даўгаполькі. Стар. 66, цана 35 кап. (На ўкраінскай мове).

4. «На литературном посту» № 20-21. Стар. 144, цана 90 кап. Дзяржаўнага Выдавецтва Масква-Ленінград.

5. „Революция и культура" № 21. Стар. 79, цана 50 кап. Выданьне газ. „Правда" Масква.

Апавяшчэньні.

— У середу, 12 сьнежня, а 7-ай гадзіне веч. у памяшканьні Поўуленьня Беларускай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў (клюб К. Маркса, пав. № 2) адбудзецца агульны сход членаў асацыяцыі—студэнтаў Беларускуніверсытэту.

Прысутнасьць усіх т. т. абавязкова.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Даводзіцца да ведама ў іх сяброў сэкцыі асьветы, што саюзам закуплен спэктакль у Дзяржтэатры на 13-XII «Заняпад вераціны». Білеты ад 1 р. 25 к.—20 кап. можна атрымаць у кацэлярыі Дому штодзённа ад 10—2 гадз. і 5—7 гадз.

— Сёньня, 11-га сьнежня, роўна а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца зачынены сход вячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Яўка без спазьненьня.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». БАЯВІК СЭЗОНУ „ЭЛІСО". Пачатак 1-га сэансу а 7 гадзіне.

КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». З аўторка, 11 сьнежня „ІЛОНА". Звыш праграмы: 2-гі тыдзень гастроляў сатырыка С. ВРОНСКАГА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 11 сьнежня „ЖОНКА САБЕІДА".

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». Гістарычны фільм „УПАД ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ". Звыш праграмы: культфільм «ВОЛХАЎБУД»

ЗГУБЛЕНЫ.

Заборная кніжка № 5766 Людзінавай П. К., выд. Барысаўскім ЦРК, кв 245.

— Лекарняная кніжка Дайнеко П., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 246.

— Всесоюзна-конская карт. Трафімава І. гр. вёскі Кузьмічы, Каралінскага райёну, кв. 247.

— Паявая кніжка № 41 Шухмана І. Ш., выд. Бобрыскім спаж. т-вам, кв. 248.

— Паявая кніжка № 1009 Мігаль М., выд. Бобрыскім спаж. т-вам, кв. 248.

— Дапрызыўная карт. Мігаль В. Ц., выд. Крупскім РВК, кв. 248.

— Конская карт. № 46 Барбога Л., выд. Крупскім РВК, кв. 248.

— Сяброўская кніжка № 15945 Кножка А., выд. Арэнскім урофсожам, кв. 248.

— Каапэрац. кніжка Крукоўскага П. Ю., выд. МЦРК, кв. 249.

— Каапэраац. кніжка № 23526 Мазельсон А. Я., выд МЦРК, кв. 250.

— Асабовае пасьведчаньне Шапіра І. С., выд. Бихаўскім РВК, кв. 251.

— Біржавы талён Грузман Г. С., выд. Біржай Працы, кв. 252.

— Асабовае пасьведчаньне Кулінайкінай Е. А., выд. Брагінскім с.-с. Гомельск. райёну, кв. 253.

— Справка аб нясудзімасьці, выд. Крымвышку на імя Зісьмана М. М., кв. 254.

— Сяброўскі білет № 1748 Смык Я. Я., выд. Заслаўск. райкомам саюза прац. зямлі і лесу, кв. 255.

— 4 біржав. талёны Кантаровіч М., выд. Менбіржай Працы, кв. 256.

— Пасьведчаньне № 167 Гельлера Я. Я., выд. БДУ, кв. 257.

— Паявая кніжка № 6370 Гразноўскага Г. Н., выд, Барысаўскім ЦРК, кв. 258.

— Закладны квіт на краму Строгіна І., выд. Барысаўскім кам. гаспад. на суму 10 руб., кв. 259.

— Каапэраац. кніжка № 9923 Рамашоўскага І. выд. МЦРК, кв. 261.

ИЗВЕСТИЯ ЦИК СССР и ВЦИК | ПРАВДА ОРГАН ЦК ВКП(б) | РАБОЧАЯ ГАЗЕТА | ТРУД — ОРГАН ВЦСПС

Белорусское Об'единенное Отделение Из-в—Минск, Советская, 61, телеф. 8-21.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА

1929 г. НА ВСЕ ГАЗЕТЫ и ЖУРНАЛЫ 1929 г.

ПОДПИСКА на все периодические издания, произведенная в одном месте, ДАЕТ ПОДПИСЧИКАМ БОЛЬШИЕ УДОБСТВА И ПРЕИМУЩЕСТВА

ВЕСЬ СССР ЧИТАЕТ ИЗВЕСТИЯ ЦИК СССР и ВЦИК | ПРАВДА Орган ЦК ВКП(б)

ЕСЛИ ВЫ ПРОИЗВОДИТЕ ПОДПИСКУ на все газеты и журналы в об'единенной конторе, ИЗВЕСТИЯ ЦИК СССР и ВЦИК | ПРАВДА Орган ЦК ВКП(б). ТО ЭТИМ ЭКОНОМИТЕ ВРЕМЯ И ДЕНЬГИ

ШИРОКИЙ ПРИЕМ ПОДПИСКИ на ВСЕ МИНСКИЕ ГАЗЕТЫ и ЖУРНАЛЫ

ПО ВЫЗОВУ ТЕЛЕФОН 8-21 СРОЧНО командируется СОТРУДНИК ДЛЯ ПРИЕМА ПОДПИСКИ и об'явлений.

ЧИТАЙТЕ ЖУРНАЛЫ: КРАСНАЯ НИВА, Новый Мир, Пути индустриал., ПРОЖЕКТОР, БОЛЬШЕВИК, Революция и культура.

ЛЮБАЯ справка о выходе и стоимости того или иного ИЗДАНИЯ ДАЕТСЯ БЕСПЛАТНО по телефону 8-21.

Прием об'явлений для всех периодических изданий СССР по редакционным ценам.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ:

В МИНСКЕ: в конторе отделения—Минск, Советская, 61, (телеф. 8-21), а также уполномоченными отделения, снабженными соответствующими документами.

В Гомеле, Витебске и Могилеве: ФИЛИАЛАМИ ОТДЕЛЕНИЯ (Гомель--Кооперативная, 12, Витебск--Ленинская, 11 и Могилев--Ленинская, 25).

В ПРОВИНЦИИ: КОНТРАГЕНТАМИ по распространению периодич. печати, а также почтов. к-рами.

Ввиду большого скопления подписки на новый год, просьба подписку сдавить заблаговременно.